Антоній
Мітрапаліт Суражскі

ЯК НАВУЧЫЦЦА МАЛІТВЕ

Антоній
Мітрапаліт Суражскі

ЯК НАВУЧЫЦЦА МАЛІТВЕ

М. А.

Фонд
«Духоўная спадчына
мітрапаліта Суражскага Антонія»

2016

УДК 281.9
ББК 86.372
А 72

Рэдактар-укладальнік: Алена Майдановіч
Рэдактары беларускага перакладу:
Наталля Васілевіч, Уладзімір Лянкевіч, Ганна Міхальчук
Пераклад з англійскай мовы: Цэнтр «Экумена»
(Наталля Васілевіч, Марына Каліноўская, Алеся Медушэўская)
Мастацкае афармленне: Юлія Янюк-Казлоўская

Антоній, мітрапаліт Суражскі
А 72 Як навучыцца малітве. М.: Фонд «Духоўная спадчына мітрапаліта Суражскага Антонія, 2016. — 88 с.

Кніга «Як навучыцца малітве» стала класікай духоўнай літаратуры, была перакладзена на шматлікія мовы. Мітрапаліт Антоній дзеліцца сваім досведам пра тое, як пачаць маліцца, калі гэта не атрымліваецца, як пераасэнсаваць свае стасункі з Богам і сваю малітоўную практыку.

ББК 86.372

© Фонд «Духоўная спадчына
мітрапаліта Суражскага Антонія», 2016
© Цэнтр «Экумена»,
пераклад на беларускую мову, 2016
© Ю. Янюк-Казлоўская, 2016

Ад выдаўцоў

Мітрапаліт Антоній (Блум) нарадзіўся ў Швейцарыі ў 1914 годзе, у сям'і супрацоўніка расійскай дыпламатычнай службы. Ранняе дзяцінства правёў у Персіі, дзе бацька будучага мітрапаліта быў консулам. Пасля Кастрычніцкага перавароту сям'я некалькі гадоў блукала па Еўропе і ў 1923 годзе пачала стала жыць ў Парыжы. Там Андрэй — так яго звалі да прыняцця манаства — скончыў школу, а потым біялагічны і медыцынскі факультэты Сарбоны. У 1939 годзе, перад сыходам на фронт хірургам французскай арміі, таемна прынёс манаскія абяцанні; у мантыю з імем Антоній быў пастрыжаны ў 1943-м. У гады нямецкай акупацыі быў лекарам у антыфашысцкім руху Супраціўлення. Пасля вайны працягваў медыцынскую практыку, а ў 1948 годзе прыняў святарскі сан і быў накіраваны на пастырскае служэнне ў Вялікабрытанію, дзе ў 1957-м стаў епіскапам Маскоўскага Патрыярхата, паводле свайго епіскапскага тытула — Сурожскі (найменне гэтай кафедры паходзіць ад старажытнай назвы горада Судак у Крыме — Сурож, аднак у нас больш звыклым і распаўсюджаным стала назва з націскам на першы склад — Суражская епархія, Мітрапаліт Антоній Суражскі). Мітрапаліт Антоній стаў вядомы на абшарах былога Савецкага Саюза як палымяны прапаведнік, дасведчаны духоўнік, які простымі, але глыбокімі словамі спаталяў духоўную

смагу сваіх слухачоў і чытачоў. За дзесяцігоддзі яго дзейнасці ў якасці мітрапаліта ў Вялікабрытаніі паства Праваслаўнай Царквы ў гэтай краіне з адзінага прыхода, які напачатку аб'ядноўваў малалікую групу эмігрантаў з Расіі, выросла ў шматнацыянальную епархію, кананічна арганізаваную, са сваім унікальным статутам у духу Сабору 1917–1918 гадоў, а таксама са шматстайнай дзейнасцю. Спачыў мітрапаліт Антоній 4 жніўня 2003 года.

Мітрапаліт Антоній шырока вядомы не толькі ў Вялікабрытаніі, але і па ўсім свеце як пастыр-прапаведнік; яго заўжды запрашалі выступаць перад самай разнастайнай аўдыторыяй (у тым ліку на радыё і тэлебачанні) з пропаведдзю Евангелля, праваслаўнага дабравесця пра жывы духоўны вопыт Царквы.

У былым Савецкім Саюзе слова ўладыкі Антонія гучала многія дзесяцігоддзі дзякуючы рэлігійным перадачам рускай службы BBC; яго прыезды ў Савецкі Саюз былі значнымі падзеямі, магнітафонныя запісы і самвыдатаўскія зборнікі яго казаняў і гутарак (прамоўленых часта ў вузкім коле блізкіх людзей на прыватных кватэрах) шырока разыходзіліся бы кругі па вадзе. Яго пропаведзь, у першую чаргу — пропаведзь Евангельскай Любові і Свабоды, мела велізарнае значэнне ў савецкія часы. Духоўны досвед, які не толькі насіў у сабе, але і ўмеў перадаць іншым мітрапаліт Антоній, — глыбока асабістыя (хоць і не замкнёныя ў асабістай набожнасці) узаемаадносіны з Богам, уцялеснены Любоўю, сустрэча чалавека «твар у твар» з Ім, чалавека, які, пры ўсёй несуразмернасці маштабу,

з'яўляецца свабодным удзельнікам гэтай сустрэчы. І хоць уладыка часта падкрэсліваў, што ён «не багаслоў», не атрымаў сістэматычнай «школьнай» багаслоўскай адукацыі, але яго казані адпавядаюць азначэнню святых айцоў: багаслоў — той, хто чыста моліцца; багаслоў — той, хто ведае Самога Бога...

Асаблівасць творчасці мітрапаліта Антонія ў тым, што ён анічога не пісаў: слова нараджалася як вусны зварот да слухача — не да безасабовага натоўпу, а да кожнага чалавека, які мае патрэбу ў жывым слове пра Жывога Бога. Таму апублікаваныя тэксты друкуюцца паводле магнітафонных запісаў і захоўваюць гучанне гэтага жывога слова.

Тэкст належыць да жанру «пазабогаслужбовых гутарак». Практыка такіх сумоўяў, вядомая ў дарэвалюцыйнай Расіі, вымушана забытая за савецкім часам, у гады ганенняў захоўвалася таемна і ў Савецкім Саюзе, аднак рэгулярны і маштабны характар насіла толькі там, дзе гэта дазвалялі ўмовы. У прыватнасці, у прыходзе Рускай Праваслаўнай Царквы ў Лондане многія гады такія гутаркі вёў мітрапаліт Суражскай епархіі Антоній.

Вось што сам уладыка расказвае пра тое, як узніклі сумоўі, якія потым склалі кнігу «Як навучыцца малітве»:

«Мяне папрасілі прамаўляць казані на вуліцах Оксфарда і паставілі на сходы бібліятэкі; сабраўся маленькі гурток людзей, які потым стаў расці і расці. Час быў — канец студзеня; халадэча была, скажам элегантна, сабачая; дзьмуў вецер. І людзі, англічане, паколькі не былі знаёмыя, стаялі прыблізна за метр адно ад аднаго, так што вецер дзьмуў вакол кожнага

і яны мерзлі па адным. Я паглядзеў на іх і вырашыў пачакаць. Яны спачатку былі ружовыя, потым пачалі сінець. І калі яны ўжо пасінелі добра так, я ім сказаў: «Ведаеце, вось вы стаіцё на такой адлегласці адно ад аднаго; калі б вы сталі шчыльней, то маглі б жыццёвым цяплом абменьвацца. Хоць вы незнаёмыя між сабою, а ўсё-ткі цяпло б дзейнічала». Яны сталі, згуртаваўшыся; прайшоў пэўны час, пярэднія ўжо паружавелі, выглядалі ўтульна, а тыя, што былі ззаду, на якіх дзьмуў вецер, пачалі зусім замярзаць. Я кажу: «Вось вы навучыліся цяпер, за кароткі час, абменьвацца жыццёвым цяплом; што калі б навучыцца абменьвацца хрысціянскім цяплом? Тыя, што наперадзе, навучыцеся пераходзіць назад і абаграваць спіны тых, хто замярзаюць; станьце за імі ўсутыч, так, каб ваша цяпло на іх пераходзіла, і дыхайце ім у спіну сваім цяплом». І цягам аднаго тыдня кожную раніцу так і адбывалася: людзі прыходзілі, станавіліся шчыльна, потым пярэднія шэрагі пераходзілі назад і абагравалі іншых... Гэтыя нашыя казані адбываліся так: я гаварыў каля гадзіны, потым паўтары гадзіны адказваў на пытанні, так што кожны мог замерзнуць, і ў тым ліку я замярзаў, бо ж я стаяў асобна, — але за кароткі час, за тыдзень, людзі навучыліся абменьвацца і жыццёвым, і чалавечым цяплом...»

Гэтыя гутаркі былі апублікаваныя ўпершыню на англійскай мове ў 1970 годзе пад назвай «School for Prayer»; яны перакладзены на шмат якія мовы; у Брытаніі кніга стала класікай духоўнай літаратуры.

Кніга «Як навучыцца малітве» — другая ў серыі перакладаў мітрапаліта Антонія на беларускую мову.

Божая адсутнасць

На самым пачатку, як мы пачынаем вучыцца малітве, я хацеў бы адзначыць, што не збіраюся гэта ні абгрунтоўваць, ні тлумачыць тэарэтычна. Мне б хацелася, хутчэй, звярнуць увагу на тое, што павінен **усведамляць** чалавек і што можа **рабіць**, калі жадае маліцца. Раз я і сам пачатковец, то дапушчу, што і вы таксама; і мы паспрабуем пачаць разам. Я не звяртаюся да тых, хто імкнецца да містычнай малітвы ці найвышэйшых ступеняў дасканаласці: гэта тое, што само сабе навучыць. Калі Бог прарываецца да нас, ці калі мы прарываемся да Бога (у пэўных выключных абставінах: ці таму, што рэчы раптоўна выяўляюць сябе з глыбіні, якой мы раней ніколі не адчувалі, ці калі мы самі ў сабе раптоўна адкрываем глыбіню, дзе малітва жыве і з якой яна можа закрынічыць), тады праблемы, як маліцца, няма. Калі мы ўсведамляем Бога, то мы стаім перад Ім, праслаўляем Яго, звяртаемся да Яго.

Такім чынам, ёсць адна важная першапачатковая праблема: калі чалавеку здаецца, што Бог адсутнічае. І менавіта пра гэта я хацеў бы цяпер пагутарыць. Безумоўна, тут я вяду гаворку не пра сапраўдную адсутнасць Бога ў рэчаіснасці — Бог ніколі не адсутнічае насамрэч — але пра пачуццё адсутнасці, якое мы перажываем, калі стаім перад Богам і галосім у пустое неба, адкуль не прыходзіць

аніякага адказу. Мы мітусімся ва ўсе бакі — і ніяк не даём рады знайсці Яго. Як нам да гэтага ставіцца?

Найперш вельмі важна памятаць, што малітва — гэта сустрэча і стасункі, глыбінная лучнасць, і да гэтай лучнасці ні нас, ні Бога нельга змусіць. Тое, што Бог можа праявіць Сваю прысутнасць ці пакінуць нас з пачуццём Сваёй адсутнасці, — частка гэтага жыцця і сапраўдных адносін. Калі б мы маглі выклікаць Бога на сустрэчу аўтаматычна, прымусіць Яго сустрэцца з намі толькі таму, што мы менавіта гэтую хвіліну прызначылі для сустрэчы з Ім, то не было б ні стасункаў, ні сустрэчы. Так можа атрымацца з карцінкай, з уяўнымі вобразамі ці з рознымі ідаламі, якія можна было б паставіць перад сабой замест Бога; але з жывым Богам мы не можам зрабіць нічога падобнага — гэтаксама, як не можам і з жывым чалавекам. Адносіны павінны пачынацца і развівацца ва ўзаемнай свабодзе. Калі зірнуць на стасункі з гледзішча разумення іх ўзаемнасці, мы пабачым, што Богу ёсць за што на нас паскардзіцца — нашмат больш, чым нам на Яго. Мы скардзімся, што Ён не праяўляе Сваёй прысутнасці на некалькі хвілін, якія мы вылучаем для Яго, а што наконт тых дваццаці трох з паловай гадзін, цягам якіх Бог можа стукацца ў дзверы, а мы адказваем: «Я заняты, выбачай». Ці не адказваем наогул, бо нават і не чуем гэтага стуку ў дзверы нашага сэрца, нашага розуму, нашага сумлення, нашага жыцця. Дык вось — мы не маем аніякага права скардзіцца на адсутнасць Бога, бо часцей мы самі адсутнічаем.

Другая вельмі важная рэч — гэта тое, што сустрэча з Богам твар у твар — заўжды суд для нас. Нельга

сустрэць Бога ці ў малітве, ці ў роздуме, ці ў сузіранні і не быць альбо збаўленымі, альбо асуджанымі. Я не маю на ўвазе канчатковага прысуду вечнага праклёну ці вечнага збаўлення, але сустрэча з Богам — гэта заўжды крытычны момант, крызіс. Само слова «крызіс» паходзіць з грэчаскай мовы і азначае «суд». Сустрэча з Богам сам-насам ў малітве — гэта крытычны момант у нашым жыцці, і дзякуй Яму, што Ён не заўсёды праяўляе нам Сябе, калі мы дабіваемся гэтай сустрэчы, бо мы маглі б яе не вытрымаць. Прыгадайце, як у многіх месцах Пісання расказваецца, наколькі небяспечна апынуцца перад абліччам Божым, таму што Бог — гэта моц, Бог — праўда, Бог — чысціня. Адпаведна, нашай першай думкай, калі мы не можам адчуць Божую прысутнасць, павінна быць падзяка. Бог міласцівы; Ён не прыходзіць заўчасна; Ён дае нам шанец самім сябе асудзіць, зразумець і не ўваходзіць у Яго прысутнасць, калі яна нам на суд і на асуджэнне.

Прывяду прыклад. Шмат гадоў таму да мяне прыйшоў чалавек і прасіў паказаць яму Бога. Я адказаў, што не магу гэтага зрабіць, але дадаў, што нават калі б і мог, то ён бы не патрапіў Яго пабачыць. Бо тады я падумаў, дый цяпер думаю так: каб сустрэць Бога, чалавек павінен мець нешта агульнае з Ім, нешта, што дае чалавеку вочы, каб бачыць, і чуйнасць, каб адчуваць. Той чалавек запытаўся ў мяне, чаму я так мяркую, а я параіў яму падумаць пару хвілін і сказаць, ці ёсць у Дабравесці нейкі ўрывак, які ўзрушыў яго найбольш, каб зразумець, якая была паміж ім і Богам сувязь. Ён сказаў: «Так, у восьмым раздзеле Евангелля паводле Яна — уры-

вак пра жанчыну, узятую ў пералюбе». Я адказаў: «Добра, гэта адно з самых прыгожых і ўзрушальных месцаў; а цяпер падумайце і спытайце сябе: хто вы сам у гэтым аповедзе? Ці Госпад, ці, прынамсі, на Ягоным баку і поўныя міласэрнасці, разумення і веры ў гэтую жанчыну, якая можа пакаяцца і стаць новым стварэннем? Ці вы — сама жанчына, узятая ў пералюбе? Ці нехта са старэйшын, якія разышліся як адзін, бо ведалі свае ўласныя грахі? Ці адзін з маладзейшых, што вагаюцца і чакаюць?» Ён паразважаў трохі, а потым сказаў: «Не, я — адзіны з іўдзеяў, які б не сышоў, а кінуў камень у жанчыну». Тады я сказаў: «Дзякуйце Богу, што Ён не дае вам сустрэцца з Ім твар у твар».

Гэты прыклад, бадай, крайні, але хіба мы не пазнаем сябе саміх у падобных сітуацыях? Не тое каб мы адкрыта адрыналі Божае слова ці Ягоны прыклад, але мы, хай не так гвалтоўна, паводзім сябе, як тыя жаўнеры падчас Пакут Хрыста: мы хацелі б закрыць Хрысту вочы, каб бесперашкодна біць Яго і каб Ён нас не бачыў. Ці ж не гэта мы чынім, калі хаваемся ад Божай прысутнасці і жывём паводле сваіх уласных пажадаў і схільнасцяў, насуперак усяму, што ёсць Божай воляй? Мы хочам зрабіць Яго невідушчым, а насамрэч асляпляем сябе саміх. Дык як жа мы можам ў такія моманты ўвайсці ў Яго прысутнасць? Можам — але толькі ў пакаянні, са скрушаным сэрцам. Але нельга ўвайсці так, каб адразу быць прынятымі з любоўю, па-сяброўску, як бы нам ні хацелася.

Паглядзіце на розныя месцы ў Дабравесці: больш выдатныя за нас людзі не адважваліся прыняць

Хрыста. Узгадайма сотніка, які папрасіў Хрыста ацаліць свайго слугу. Хрыстос сказаў: «Я прыйду», але сотнік адказаў: «Не трэба прыходзіць — скажы толькі слова, і слуга мой акрыяе». Ці робім мы так? Ці звяртаемся мы да Бога, кажучы: «Не рабі Сябе яўным, адчувальна прысутным для мяне; досыць, каб Ты проста сказаў слова, — і я акрыяю. Досыць Табе сказаць толькі слова — і яно здзейсніцца. Мне большага пакуль і не трэба...» Ці ўзгадайма Пятра ў чоўне пасля вялікага ўлову рыбы, калі ён ўкленчыў і выгукнуў: «Пакінь мяне, Госпадзе, я чалавек грэшны». Ён прасіў Госпада пакінуць човен, бо адчуў сябе нікчэмным; а адчуў сябе нікчэмным таму, што раптам убачыў веліч Ісуса Хрыста. Ці не здараецца такое калі-нікалі і з намі? Вось мы чытаем Дабравесце — і вобраз Хрыста раптам становіцца для нас чароўным і слаўным; вось мы молімся — і нас ахінае веліч і святасць Бога, і ці гаворым мы тады: «Я не варты, каб Ты ўвайшоў да мяне»? А што сказаць пра ўсе выпадкі, калі мы павінны усведамляць, што Ён і не можа прыйсці да нас, таму што нас саміх тут і няма, каб прыняць Яго. Мы хочам атрымаць штосьці ад Яго, а зусім не Яго Самога. Ці ж гэта стасункі? Хіба так мы паводзім сябе з нашымі сябрамі? Ці шукаем мы таго, што гэтае сяброўства можа нам даць, альбо нам патрэбен сам сябар, якога мы любім? Ці так сама ў дачыненні да Госпада?

Паразважайма пра нашыя малітвы — вашы і мае: якой гарачай, глыбокай і моцнай бывае малітва, калі молішся за кагосьці, каго любіш, ці за штосьці значнае ў жыцці. Тады сэрца адкрытае, усё ўнутранае «я» сабранае ў малітве. Ці значыць гэта, што сутнасць

такой малітвы — у Богу? Не, гэта проста значыць, што прадмет малітвы важны. Бо калі пасля такой гарачай, глыбокай і моцнай малітвы за чалавека, якога любім, ці за сітуацыю, якая турбуе, мы пераходзім да іншай тэмы, якая ўжо не мае такой важнасці, тады раптам малітва астывае. Што змяняецца? Хіба гэта Бог астывае ці сыходзіць? Не, гэта значыць, што ўсё натхненне і моц малітвы нарадзіліся не ад Божай прысутнасці, не ад веры ў Яго, прагі па Ім, чуласці да Яго; яны нарадзіліся з клопату пра кагосьці ці штосьці, а не пра Бога. Чаго нам тады здзіўляцца, што мы адчуваем адсутнасць Бога? Гэта мы самі адсутнічаем, гэта мы ахалоджваемся, калі нас Бог больш не клапоціць. Чаму? Бо Ён не мае для нас асаблівай важнасці.

Часам Бог «адсутнічае» і з іншых прычын. Пакуль мы сапраўдныя, пакуль мы з'яўляемся самімі сабой, Бог можа прысутнічаць і нешта рабіць з намі. Але як толькі мы стараемся быць тымі, кім не з'яўляемся, то нічога не можам сказаць ці зрабіць; мы становімся фіктыўнымі асобамі, існаванне якіх несапраўднае, і да нашага несапраўднага існавання Бог не можа наблізіцца.

Каб мець здольнасць маліцца, мы павінны быць ў стане, які можна акрэсліць як Царства Божае. Мы павінны ўсвядоміць, што Ён Бог, што Ён Цар, мы павінны даручыць сябе Яму. Мы заўжды павінны хаця б памятаць пра Яго волю, нават калі мы яшчэ не здольны выконваць яе. Калі ж не, калі мы ў сваіх адносінах да Бога — як той заможны юнак, які не мог пайсці за Хрыстом, бо быў занадта багатым, — як тады мы можам сустрэць Яго? Так часта праз

малітву, праз глыбокую лучнасць з Богам, па Якім мы тужым, мы проста шукаем для сябе перажыванняў шчасця; і мы не гатовы прадаць усё, што маем, каб набыць каштоўную жамчужыну. Як жа тады мы можам здабыць гэтую жамчужыну? Ці яе мы шукаем? Ці не падобна і ў чалавечых адносінах: калі мужчына ці жанчына пакахаюць кагосьці, усе іншыя людзі больш не маюць для іх такога ж значэння. Гэта адлюстравана ў кароткім старажытным выслоўі: «Калі ў чалавека ёсць нявеста, вакол ужо не мужчыны і жанчыны, а проста людзі».

Ці ж не гэта можа і павінна адбывацца з усякім нашым багаццем, калі мы звяртаемся да Бога? Ці не павінна яно стаць бляклым і шэрым, толькі агульным фонам, на якім з усёй выразнасцю будзе вылучацца толькі адзін, найбольш важны вобраз? Мы б хацелі, каб на агульнай карціне нашага жыцця, поўнай цёмных фарбаў, заззяў бы адзін-адзіны мазок нябеснага блакіту. Бог гатовы заставацца па-за нашым жыццём. Ён можа ўзяць яго цалкам, як крыж, але проста быць адной з акалічнасцяў нашага жыцця Ён не гатовы.

Таму, калі мы думаем пра адсутнасць Бога, ці не варта нам задаць пытанне самім сабе — хто ў гэтым вінаваты? Мы заўжды вінавацім Бога, заўжды абвінавачваем Яго — ці проста ў твар, ці перад людзьмі — у тым, што Ён адсутны, у тым, што Яго ніколі няма, калі Ён патрэбен, што Ён ніколі не адказвае на малітвы, звернутыя да Яго. У часы большай «набожнасці» (менавіта ў двукоссі) мы кажам: «Бог выпрабоўвае маё цярпенне, маю веру, маю пакорлівасць». Мы знаходзім любыя спосабы

пераКруціць Божы суд супраць нас у праслаўленне саміх сябе: «Я такі цярплівы, што дам рады цярпець Самога Бога!» Хіба не так?

Неяк, калі я быў маладым святаром і прамаўляў у сваім прыходзе адну са шматлікіх сваіх казаняў, маладая дзяўчына падышла да мяне і сказала: «Ойча Антоніе, вы, напэўна, вельмі кепскі чалавек». Я адказаў: «Сапраўды так, але адкуль вы пра гэта даведаліся?» Яна кажа: «Таму што вы так добра апісалі нашы грахі, што няйнакш вы ўсе іх самі ўчынілі!» Безумоўна, дрэнныя думкі і станы, якія я цяпер вам апісваю, магчыма, не вашы, а мае, але, можа, і вашы таксама, хоць у меншай ступені.

З **чаго** пачаць, калі мы жадаем маліцца, — дык гэта з пэўнасці, што мы грэшнікі, якія маюць патрэбу ў збаўленні, што мы адрэзаны ад Бога і не можам жыць без Яго, а таксама што мы можам прапанаваць Богу адно толькі адчайную прагу стаць такімі, якімі б Ён прыняў нас: у пакаянні, з міласэрнасцю і любоўю. Дык вось, малітва, з самага пачатку, — гэта наша сціплая спроба падняцца на прыступку ўгору ў напрамку да Бога. Гэта момант, калі мы паварочваемся да Яго, але не асмельваемся наблізіцца, ведаючы, што пакуль Ягоная ласка не зробіць нас здольнымі спаткацца з Ім, такая заўчасная сустрэча будзе нам судом. Адзінае, што мы можам зрабіць, гэта павярнуцца да Яго — поўныя пашаны, усхваляванай набожнасці, малітоўнага пакланення, страху Божага, на якія мы толькі здатныя, з усёй увагай і ўдумлівасцю, якія мы толькі можам мець, і прасіць Яго зрабіць з намі нешта, што дасць нам здольнасць сустрэцца з Ім твар у твар, не на суд і не на асуджэнне, але дзеля жыцця вечнага.

Я хацеў бы нагадаць вам прыпавесць пра фарысея і мытніка. Мытнік прыходзіць і становіцца на дзядзінцы храма, ён ведае, што стаіць асуджаны, ведае, што па справядлівасці для яго няма надзеі, бо ён па-за Царствам Божым, царствам праведнасці і царствам любові, бо ён не належыць ні да царства праведнасці, ні да царства любові. Але ў сваім жорсткім, поўным гвалту, агідным жыцці ён навучыўся нечаму, пра што праведны фарысей не мае аніякага ўяўлення. Ён навучыўся, што ў свеце спаборніцтва, у свеце хцівых жывёл, у свеце жорсткасці і бессардэчнасці адзіная надзея чалавека — гэта ўварванне міласэрнасці і спачування, цалкам нечаканае і неймавернае, якое не мае вытокаў ні ў абавязку, ні ў натуральных узаемадносінах, і толькі яно магло б спыніць дзеянне жорсткага, гвалтоўнага і бессардэчнага свету, у якім мы жывём. Адзінае, што яму вядома з таго, напрыклад, што ён сам вымагальнік, ліхвяр, злодзей, — дык гэта тое, што ёсць моманты, калі, насуперак пануючым у свеце поглядам, без дай прычыны ён даруе доўг, бо знянацку ягонае сэрца становіцца мяккім і ўражальным, а іншым разам ён не адпраўляе кагосьці ў вязніцу, бо твар нагадае яму нешта ці голас пройдзе проста ў сэрца. У гэтым няма ніякай логікі. Гэта не характэрна ні для таго, як прынята ў свеце, ні для яго звычайных паводзін. Гэта нешта, што прарываецца, што цалкам бессэнсоўнае, але супраціўляцца чаму немагчыма. Ён таксама ведае, як часта сам, магчыма, быў выратаваны ад канчатковай катастрофы гэтым нечаканым і неймаверным умяшаннем міласэрнасці, спа-

чування, даравання. І вось ён стаіць на дзядзінцы, ведаючы, што ўся прастора ўнутры храма — гэта прастора праведнасці і боскай любові, да якой ён не належыць і ў якую ён не можа ўвайсці. Але ён таксама ведае з досведу, што здараецца нават немагчымае, і таму ён просіць: «Памілуй мяне, паруш законы справядлівасці, паруш законы рэлігіі, спусціся да нас у міласці, да тых, у каго няма ніякага права ні быць прабачанымі, ні ўвайсці ўсярэдзіну». І я думаю, што менавіта адсюль, пастаянна, мы і павінны пачынаць зноў і зноў.

Ці памятаеце вы два ўрыўкі з апостала Паўла, дзе ён гаворыць: «Мая сіла праяўляецца ў слабасці». Слабасць — гэта не такая слабасць, якую мы праяўляем, калі грашым і забываем Бога, але іншая слабасць, сэнс якой у тым, каб быць цалкам падатлівымі, цалкам празрыстымі, цалкам пакінутымі ў руках Божых. Мы звычайна стараемся быць моцнымі і гэтым замінаем Богу праяўляць сваю магутнасць.

Вы памятаеце, як вас у дзяцінстве вучылі пісаць? Маці давала вам у руку аловак, брала вашу руку ў сваю і пачынала рухаць ёй. Пакуль вы зусім не ведалі, што яна хацела рабіць, вы пакідалі сваю руку зусім расслабленай у яе руцэ. Гэта тое, што я маю на ўвазе, гаворачы аб праявах магутнасці Божай у слабасці. Можна ўявіць гэта таксама на прыкладзе ветразя. Ён можа напоўніцца ветрам і накіроўваць увесь човен менавіта дзякуючы сваёй падатлівасці. Калі замест ветразя вы ўсталюеце цвёрдую дошку, яна не спрацуе; менавіта слабасць ветразя робіць яго адчувальным да ветру. Тое самае можна сказаць і пра жалезную рукавіцу ў параўнанні з хірургічнай

пальчаткай. Якой бы цвёрдай і трывалай не была рукавіца, яна не можа зрабіць такіх цудаў, якія падуладныя хірургічнай пальчатцы ў разумных руках — менавіта дзякуючы яе эластычнасці. Дык вось, адзін з урокаў, якому нас зноў і зноў спрабуе навучыць Бог, наступны: замест уяўнай і мізэрнай нашай сілы займець крохкасць, гнуткасць і цалкам аддаць сябе ў рукі Божыя.

Прывяду вам прыклад. Дваццаць пяць гадоў таму адзін мой сябар, у якога былі дзеці, быў забіты падчас вызвалення Парыжа. Пры жыцці ягоныя дзеці заўжды ненавідзелі мяне, бо яны раўнавалі, што ў іх бацькі быў сябар. Але калі бацька памёр, яны павярнуліся да мяне, бо я быў бацькавым сябрам. Адна з іх, пятнаццацігадовая дзяўчына, аднойчы завітала да мяне ў хірургію (да таго, як стаць святаром, я быў лекарам), і яна пабачыла, што, апроч медыцынскіх прылад, у мяне на стале ляжала Евангелле. І вось яна з усім юначым запалам кінула: «Я не магу зразумець, як адукаваны чалавек можа верыць у такую лухту». Я спытаў: «А ты калі-небудзь чытала яго?» Яна адказала: «Не». Тады я сказаў: «Запомні, што толькі дурні мяркуюць пра рэчы, якіх не ведаюць». Пасля гэтага яна прачытала Евангелле і настолькі захапілася, што ўсё яе жыццё змянілася, бо яна пачала маліцца і Бог даў ёй досвед сваёй прысутнасці, і некаторы час яна жыла гэтым досведам. Потым яна захварэла на невылечную хваробу і напісала мне ліст, калі я ўжо стаў святаром і жыў у Брытаніі: «Паколькі маё цела пачало слабець і вымірaць, мой дух стаў больш жывым, чым калі-небудзь раней, і я адчу-

ваю Божую прысутнасць так лёгка і так радасна». Я напісаў ёй у адказ: «Не чакай, што гэтак жа будзе працягвацца. Калі ты страціш яшчэ трохі сіл, ты больш не зможаш павярнуцца і кінуцца ў кірунку Бога, і тады ты адчуеш, што больш не маеш доступу да Яго». Праз некаторы час яна напісала зноў: «Так, я стала настолькі слабой цяпер, што не магу зрабіць высілкаў, каб рушыць да Бога ці нават проста жадаць Яго актыўна. І Бог сышоў». Але я адказаў: «Цяпер зрабі нешта іншае. Паспрабуй навучыцца пакоры ў сапраўдным, глыбокім сэнсе гэтага слова».

Лацінскае слова *humilitas*, «пакора», паходзіць ад слова *humus*, якое азначае «ўрадлівая глеба». Для мяне пакора заключаецца не ў тым, каб, як мы гэта часцяком робім, «прыбядняцца» і нагаварваць на сябе, нібы мы горшыя за ўсіх, і пераконваць у гэтым іншых, нібы такія штучныя паводзіны і ёсць пакора. Пакора — гэта стан глебы. Зямля заўжды ў нас пад нагамі, успрымаецца як данасць, пра яе ніколі не памятаюць, яе пастаянна топча першы-лепшы, яна адкрытая для ўсяго, і мы выкідаем і выліваем на яе ўсякае смецце, усё, што нам не трэба. Яна ляжыць, маўклівая, і ўсё прымае, і цудоўным чынам робіць з адкідаў новае багацце — насуперак разбурэнню, пераўтвараючы само разбурэнне ў сілу жыцця і новую магчымасць стваральнасці. Яна адкрытая да сонечнага святла, адкрытая да дажджу, гатовая прыняць любое насенне, якое ў яе кідаюць, і здольная прынесці з кожнага зярнятка плён — трыццацікроць, шасцідзесяцікроць ці стакроць.

Я параіў гэтай жанчыне: «Вучыся быць такой жа перад Богам; пакінутай, пакорлівай, гатовай прыняць што заўгодна ад людзей і ад Бога». І сапраўды, ад людзей яна атрымала багата; за шэсць месяцаў хваробы яе муж стаміўся ад паміраючай жонкі ды кінуў яе, так што памыі былі выліты шчодра. Але Бог таксама азараў Сваім святлом і акрапляў Сваім дажджом, бо праз некаторы час яна напісала мне: «Я цалкам адпрацаваная. Я не магу рухацца ў кірунку Бога, але цяпер Сам Бог робіць крокі, спускаючыся да мяне».

Гэта не адзіная гісторыя, якая ілюструе мае словы, але яна трапная: гэта слабасць, у якой Бог можа сведчыць сваю сілу, гэта сітуацыя, у якой адсутнасць Бога можа стаць Яго прысутнасцю. Мы не можам злавіць Бога. Але дзе б мы ні былі — ці як мытнік, ці як гэтая жанчына — мы можам сустрэць Бога па-за сферай «правільнага», толькі ў сферы міласці.

Паспрабуйце падумаць пра адсутнасць Бога і зразумейце, што перад тым, як стукацца ў дзверы (і памятайма, што гэта не толькі дзверы ў Царства ў агульным разуменні, але што Хрыстос сапраўды кажа: «Я ёсць дзверы»), — перад тым, як пастукаць ў іх, вы павінны зразумець, што вы звонку. Калі вы марнуеце час, па-вар'яцку ўяўляючы, быццам вы ўжо ў Царстве Божым, няма ніякага сэнсу стукацца ў дзверы, каб яны адчыніліся. У такім разе азірніцеся: можа, пабачыце навокал ангелаў ды святых, а таксама хорам, які вам належыць. А калі, апроч цемрадзі і сцен, вы нічога не пабачыце, то небеспадстаўна падзівіцеся, чаму гэта рай такі непрывабны. Мы ўсе павінны зразумець, што мы

яшчэ не ў раі, што мы ўсё яшчэ звонку Царства Божага, і тады спытаць саміх сябе: «Дзе дзверы і як ў іх стукацца?»

У наступным раздзеле мы паспрабуем больш заглыбіцца ў тэму стукання ў дзверы і таго, як увайсці ўсярэдзіну, стаць насельнікам Раю, месца, дзе малітва магчымая.

Вось дзверы — стукай

Кажучы пра наша ўспрыняцце адсутнасці Бога, якое, відавочна, не аб'ектыўнае, а суб'ектыўнае, я ўжо адзначаў: калі мы не ўсведамляем, што знаходзімся па-за межамі Царства Божага і неабходна стукацца, каб нам дазволілі ўвайсці, то мы можам правесці значную частку жыцця, уяўляючы, нібыта мы ўжо ўнутры, і паводзячы сябе адпаведна, але так ніколі і не дасягнуць глыбіні, на якой Царства Божае раскрываецца ва ўсім харастве, праўдзе і славе.

Гаворачы, што мы знаходзімся па-за межамі Царства Божага, я не маю на ўвазе проста сітуацыю, у якой мы знаходзімся цалкам звонку альбо цалкам унутры. Хутчэй, нам варта думаць пра гэта ў плане паступовага руху ад глыбіні да глыбіні, ад вышыні да вышыні, як вам больш даспадобы, так што з кожным крокам мы ўжо здабываем нешта каштоўнае і глыбокае, але разам з тым заўжды працягваем імкнуцца і ісці наперад да чагосьці яшчэ больш каштоўнага і глыбокага. Гэта вельмі важна памятаць, бо, нават калі мы звонку, мы неверагодна багатыя. Госпад дае нам так шмат, мы настолькі інтэлектуальна і эмацыянальна адораныя, наша жыццё такое напоўненае, што мы можам уявіць, нібы нічога большага за гэта быць не можа, быццам мы ўжо знайшлі паўнату і цэласнасць і ўжо няма чаго шукаць. Але нам трэба засвоіць, што заўжды ёсць нешта большае. Мы павінны радавацца, што

ў нашай беднасці мы такія багатыя; аднак мы мусім імкнуцца да сапраўдных скарбаў Царства, асцерагаючыся задаволіцца тым, што ўжо маем, каб не адвярнуцца ад таго, што чакае наперадзе.

Важна памятаць: усё, што мы маем, — гэта дарунак. Першая запаведзь шчаснасці — беднасць ці ўбогасць, і толькі калі мы жывём паводле яе, мы можам увайсці ў Царства Божае. Гэтая запаведзь мае два аспекты. Па-першае, гэта вельмі ясны факт, хочам мы гэтага ці не, але па праўдзе нам не належыць нічога з таго, чым мы можам валодаць; гэтае адкрыццё, што я нішто і нічога не маю, — абсалютная, непапраўная, безнадзейная беднасць. Мы існуем таму, што былі пакліканыя да існавання і прыведзеныя ў быццё. Мы самі нічога для гэтага не зрабілі, гэта не было актам нашай свабоднай волі. У нас жыццё можна адняць, у гэтым сэнсе яно нам не належыць, і такім чынам усё, што мы ёсць, і ўсё, што мы маем, недаўгавечнае. Мы маем цела — яно памрэ. Мы маем розум — аднак дастаткова аднаму маленькаму сасуду ў мозгу разарвацца, і найлепшы розум будзе знішчаны. Мы маем сэрца, жывое і чуллівае — але ж надыходзіць момант, калі мы хацелі б выказаць усю сімпатыю, усё разуменне камусьці, хто мае ў гэтым патрэбу, а ў гэтую хвіліну яно маўчыць, нібы камень.

Так, у пэўным сэнсе мы можам сказаць, што ў нас нічога няма, бо нішто з таго, чым мы валодаем, нам не належыць. Але гэта магло б прывесці нас не да адчування прыналежнасці да Царства Божага і радасці ў ім, а да адчаю. Аднак мы не памятаем, што хоць ніякія рэчы і не належаць нам у тым сэнсе, што не

могуць быць аднятыя ад нас, усё ж мы імі валодаем. Гэта другі аспект запаведзі. Мы багатыя, і ўсё, чым мы валодаем, ёсць дарунак і знак любові — Божай і чалавечай, дарунак бясконцай боскай любові. І пакуль нам нічога не належыць, боская любоў праяўляецца несупынна і поўна. Але ўсё, што мы бяром у сваё распараджэнне, выключаецца з прасторы любові. Безумоўна, гэта становіцца нашым, але любоў страчваецца. І толькі той, хто ўсё аддае, спасцігае сапраўдную, абсалютную, канчатковую, незваротную духоўную беднасць і атрымлівае любоў Божую, праяўленую ва ўсіх Яго дарунках. Адзін з нашых багасловаў[1] сказаў: «Уся ежа гэтага свету — гэта боская любоў, што стала ядомай». Я думаю, што гэта сапраўды так. І ў той момант, калі мы спрабуем узбагаціцца, моцна трымаючы штосьці ў руках, мы страчваем і прайграем, бо пакуль у нашых руках нічога няма, мы вольныя ўзяць ці пакінуць, рабіць што заўгодна.

Гэта і ёсць Царства — адчуванне, што мы свабодныя ад валодання, і гэтая свабода ўмацоўвае нас у стасунках, у якіх усё ёсць любоў — любоў чалавечая і любоў Божая.

І вось калі мы разважаем у такіх паняццях, мы можам перанесці тую ж ідэю да сказанага раней. Так, мы багатыя. Аднак ніколі нельга спакушацца тым, чым мы валодаем, і падманвацца, быццам зараз можна зруйнаваць старыя свірны і збудаваць новыя, каб назбіраць больш скарбаў. Але нічога немагчыма назапасіць — нічога, акрамя самога Царства Божага. І тады мы можам адкінуць рэчы адну за другой,

[1] Прот. Аляксандар Шмеман у кнізе «За жыццё свету» (заўв. рэд.)

каб ісці наперад вольнымі — вольнымі ад багацця. Вы калі-небудзь заўважалі, што заможнасць заўжды азначае збядненне — на нейкім іншым узроўні? Досыць сказаць: «Гэты гадзіннік мой» і схапіць яго ў руку, і вось — гадзіннікам мы завалодалі, але руку страцілі. І калі вы розумам зацыкленыя на сваіх скарбах, калі вы закрываеце сэрца, каб надзейна і назаўжды захаваць тое, што ў ім ёсць, тады і сэрца, і розум памяншаюцца да памераў той рэчы, да якой вы прывязаныя.

І калі гэта так, то, як толькі мы апусціліся на дно, зразумелі, што ніякія рэчы нам не належаць, тады мы наблізіліся да Царства Божага, амаль усвядомілі, што Бог ёсць любоў і што Ён захоўвае нас сваёй любоўю. І тады можна сказаць адразу дзве рэчы. Можна маліцца з глыбіні сваёй пакінутасці, убогасці і нэндзы і радавацца таму, што мы надзвычай багатыя Божай любоўю. Але гэта магчыма, толькі калі мы самі адкрылі гэта, бо, пакуль мы ўяўляем сябе багатымі, дзякаваць Богу няма за што і мы не можам заўважыць любові да нас. Вельмі часта наша ўдзячнасць і пакаянне, якія мы прыносім Богу, занадта агульныя.

Я перажыў гэта аднойчы ў вельмі нерамантычнай і недухоўнай сітуацыі. Памятаю адну паездку, калі я быў падлеткам. Тады я разлічыў час падарожжа вельмі дакладна, каб прыехаць у абед, бо думаў, што ў гэты час людзі ніяк не змогуць пакінуць мяне чакаць у іншым пакоі і абавязкова прапануюць пад'есці. Але, вядома ж, цягнік спазніўся, і мы прыехалі пасля абеду, вельмі галодныя. Я быў з сябрам, і паколькі мы сапраўды вельмі хацелі есці, то папрасілі нас

чым-небудзь падсілкаваць. Нам далі паў-агурка. Мы зірнулі на агурок, адзін на аднаго і падумалі: «І гэта ўсё, што Госпад можа нам даць?» Тады сябар сказаў: «Прачытаем малітву падзякі». Я падумаў: «Божухна, дзякаваць за нейкі агурок!» Мой сябар быў лепшым і больш набожным вернікам, таму мы прачыталі разам Дзявятую гадзіну і яшчэ некалькі малітваў, пасля малітву на блаславенне ежы, і ўвесь час мне было складана не думаць пра гэтую палову агурка, чвэрць якога дастанецца мне. І потым мы разламалі агурок і з'елі. За ўсё жыццё я не быў так удзячны Богу ні за якую колькасць ежы. Я еў яго, быццам святую ежу. Асцярожна, каб не страціць ніводнага моманту асалоды ад свежага агурка. Калі мы скончылі, я без ваганняў прапанаваў: «А цяпер падзякуйма Госпаду», і мы зноў пачалі маліцца з удзячнасцю.

Мы не можам жыць малітоўным жыццём, не можам рухацца насустрач Госпаду, калі не вызвалімся ад валодання, каб абедзьве рукі былі вольныя, а сэрца цалкам адкрытае — не так, як кашалёк, які мы баімся трымаць адкрытым, каб з яго не выпалі грошы, але як адкрыты і пусты кашалёк, — і таксама розум, адкрыты да невядомага і нечаканага. Толькі так мы можам быць багатымі і адначасова цалкам вольнымі ад багацця. І ў гэты момант мы можам сказаць, што, хоць і знаходзімся па-за Царствам, усё ж мы ўнутрана такія багатыя і вольныя.

Тое ж адбываецца, калі мы посцім. Я маю на ўвазе не пост і ўстрыманне, якія закранаюць толькі наш страўнік, але той стан цвярозасці, які дазваляе — ці нават вымушае — ніколі не станавіцца рабом чагосьці. Гэта пытанне ладу ўсяго нашага

жыцця. Найперш гэта тычыцца нашага ўяўлення, бо менавіта з яго пачынаецца грэх. Адзін з нашых праваслаўных багасловаў у IX стагоддзі[1] сказаў, што грэх плоці — гэта грэх, які дух чыніць супраць плоці. Не плоць адказная за грэх, і я думаю, што ў гэтым сэнсе мы павінны навучыцца кантраляваць нашу фантазію і нашы ўяўленні. Пакуль наша ўяўленне і наша фантазія намі не авалодалі, рэчы існуюць асобна ад нас; калі наша фантазія засяроджваецца на рэчах, мы да іх прывязваемся. Вы ведаеце, што існуюць такія рэчы, як мяса, агародніна, ласункі і ўсё такое. Вы ведаеце гэта як аб'ектыўны факт. Калі вы спыніцеся і падумаеце: «Я не асабліва галодны, але ж ёсць столькі смачнага. Чаго б мне хацелася?», то праз пяць хвілін вы выпусціце «шчупальцы» і захочаце шмат чаго з'есці. Вы станеце прывязаныя да зямлі, як Гулівер, спачатку адным валаском, потым яшчэ адным і яшчэ адным; кожны з валаскоў вельмі тонкі, але разам яны вельмі моцна трымаюць. Як толькі вы дазволілі вольны палёт фантазіі, сітуацыя ўскладніцца. У гэтым сэнсе нам важна быць цвярозымі і змагацца за свабоду. Ёсць вялікая розніца паміж любоўю і прывязанасцю, голадам і хцівасцю, жывой дапытлівасцю і пустой цікаўнасцю. Кожная наша натуральная якасць мае пару, адзначаную злом, праз якую мы можам стаць рабамі. Гэта я і меў на ўвазе, гаворачы пра шчупальцы. Для пачатку скажыце «не». Калі вы гэтага не сказалі, рыхтуйцеся да лютай бітвы. Тады зма-

[1] У іншых месцах мітр. Антоній атрыбутуе гэтую цытату неназванаму святому айцу V стагоддзя. Падобна, што маецца на ўвазе Тэртуліян (заўв. рэд.).

гайцеся бязлітасна, таму што цвярозасць і непрывязанасць больш каштоўныя за тую асалоду, якую вы атрымаеце ў рабстве.

Калі ўсё, што я сказаў раней, праўда, мы павінны стукацца ў дзверы. Пэўныя праблемы на гэтым этапе абвастраюцца. Каб гэта былі дзверы нейкай царквы, усё было б проста: мы б прыйшлі і пастукалі. Але праблема у тым, што мы зазвычай не ведаем, куды стукаць. Людзі так часта хочуць маліцца і пытаюць сябе: «Куды скіраваць малітву? Куды трэба звярнуць позірк і сэрца?» Для мусульманіна ўсё проста: трэба павярнуцца ў бок Меккі. Добра, вось мы павярнуліся на ўсход, і што далей? Нельга засяроджвацца на чымсьці, меншым за Бога. Калі мы спрабуем засяродзіцца на богу ўяўным, гэта значыць богу, якога можна ўявіць, мы рызыкуем паставіць паміж сабой і сапраўдным Богам ідала. Гэтую думку яшчэ ў IV стагоддзі выказаў св. Рыгор Багаслоў. Ён казаў: у момант, калі мы ставім перад сабой бачны знак, ці то крыж, ці то храм, ці то ікону, альбо нябачны знак — Бога, як мы Яго самі ўяўляем, альбо Хрыста, якім мы бачылі яго на абразах, — і засяроджваемся на гэтым, мы ўзводзім паміж сабой і Богам бар'ер, бо мы падмяняем асобу, да якой звяртаемся ў малітве, прыдуманай намі выявай. А зрабіць трэба вось што: неабходна сабраць усе нашыя веды пра Бога, каб увайсці ў Ягоную прысутнасць, але пры гэтым памятаць: усё, што нам вядома пра Бога — гэта нашае мінулае, якое засталося за нашымі плячыма, і мы стаім твар у твар перад Богам ва ўсёй Ягонай складанасці, усёй Ягонай простасці, перад такім блізкім і, аднак, яшчэ невядомым. Толькі калі мы

цалкам адкрытыя да невядомага, яно можа нам — якія мы сёння ёсць — адкрыць сябе, як захоча. Вось так, з адкрытым сэрцам і адкрытым розумам нам належыць стаць перад Богам без спроб надаць Яму форму або абмежаваць Яго нашымі канцэпцыямі і вобразамі, і мы мусім стукаць у дзверы.

Куды?.. Евангелле кажа, што Царства Божае найперш унутры нас. Калі мы не здольныя знайсці Царства Божага ўнутры сябе, калі мы не можам сустрэць Бога ўсярэдзіне, у самай нашай глыбіні, то верагоднасць сустрэць Яго звонку мізэрная. Калі Гагарын вярнуўся з космасу і зрабіў вядомую заяву, што Бога на небе ён не пабачыў, адзін з маскоўскіх святароў адзначыў: «Калі вы не ўбачылі Яго на зямлі, то пагатоў не ўбачыце Яго і на небе». Гэта таксама тычыцца нашай размовы. Калі мы не можам знайсці сувязі з Богам пад нашай скурай, у тым малым сусвеце, які сабой уяўляем, то малаверагодна, што нават пры сустрэчы з Ім твар у твар мы зможам пазнаць Яго. Св. Ян Залатавуст казаў: «Адшукай дзверы свайго сэрца, і зразумееш, што гэта дзверы ў Царства Божае». Так што нам трэба звяртацца ўглыб сябе, а не да навакольля — пры гэтым звяртацца да сябе адмысловым чынам. Гаворка не пра самааналіз. Я таксама не маю на ўвазе, што трэба паглядзець у сябе, як прынята ў псіхааналізе ці псіхалогіі. Гэта не падарожжа да свайго ўласнага «я», гэта падарожжа скрозь сваю сутнасць, каб выйсці з глыбіні сябе да месца, дзе ёсць Ён; месца, дзе мы — Бог і я — можам сустрэцца.

Так што ў гэтым пытанні малітвы пачаткоўца ёсць два аспекты: па-першае, гэта шлях углыб сябе,

па-другое, выкарыстанне слоў малітвы і іх напрамак.

Зараз я закрану другі аспект. Да чаго, да каго павінен я скіраваць сваю малітву? Вельмі часта людзі спрабуюць крычаць у неба і здзіўляюцца, што неба пустое і ім не адказвае. Адказ можна пачуць не адтуль. Духоўны аўтар VII стагоддзя св. Ян Лесвічнік пісаў, што малітва, словы малітвы падобныя да стралы. Аднак мала проста мець стралу. Калі вы хочаце пацэліць, неабходны лук з тугой цецівой і моцныя рукі, каб добра стрэліць. Калі вы маеце спраўны лук і не ўмееце страляць, страла праляціць некалькі метраў і ўпадзе. Калі рука слабая, то страла не дасягне мішэні. Нам спатрэбяцца лук, цеціва, рукі і моц. Вось калі словы малітвы — гэта стрэлы, мы павінны скіраваць іх на самую глыбіню, дзе ўнутры нас можна сустрэць Бога; навесці свой лук так, каб стрэліць унутр сябе як найглыбей. Па-другое, патрэбна даць страле ўсё неабходнае, каб яна паляцела далёка. Вельмі часта мы няўважлівыя ў малітве; наша сэрца не гарыць ёю, і малітва не падмацоўваецца нашым жыццём. Вось такая, так бы мовіць, аналогія з лукам, стралой і моцай.

Бывае, калі спрабуюць прабіцца да глыбіні, гукаючы Яго, Таго, Хто на пачатку і ў глыбіні ўсяго. Але вы дакладна ўбачыце, куды вы ідзяце і куды скіроўваць малітву: не назад, не ўвышыню, але глыбей і глыбей — праз любую перашкоду на шляху, праз любую падманлівую хітрасць, праз усё, што замінае дасягнуць самай глыбіні. І так малітва зробіцца вельмі рэальнай, хоць і цяжкай, напружанай і смелай працай.

Найперш, трэба выбраць малітву. Гэта вельмі важна. Наколькі важна выбіраць правільныя сло-

вы ў стасунках з людзьмі, настолькі ж гэта важна і ў малітве. Якую б малітву мы не выбралі, яна павінна мець для нас сэнс і не прыносіць дыскамфорту. Прызнаюся, што пры ўважлівым чытанні малітоўніка я вельмі часта адчуваю дыскамфорт. Мне здаецца, што калі б Бог сапраўды прысутнічаў, знаходзіўся вось тут непасрэдна перада мной, я б дакладна не наважыўся рабіць такія плоскія пафасныя заявы і расказваць Яму пра Яго Самога тое, што Ён ведаў задоўга да майго прыходу ў свет. Выбірайце дбайна, бо калі вы саромеецеся ўласнай малітвы, Богу можа быць няёмка і ад вас, і ад вашай малітвы, і вы ніколі не здолееце звярнуцца да Яго ад усяго сэрца. Таму першая задача — сапраўды знайсці словы малітвы, вартыя вас і вартыя Бога. Я кажу «вартыя вас і вартыя Бога», бо калі яны недастаткова добрыя для вас, не турбуйце імі Бога. Ён чуў і больш красамоўныя словы. Аднак не трэба шукаць нейкіх надзвычайных выразаў, гэта адна з небяспек у малітве — шукаць словы, якія былі б на ўзроўні Бога. На жаль, паколькі ніхто з нас не знаходзіцца на адным узроўні з Ім, у нас гэта не атрымліваецца і мы марнуем час на пошукі быццам бы правільных слоў.

Я не буду намагацца закрануць усе аспекты, але хацеў бы прывесці прыклад важнасці малітоўнага чыну ці слоў малітвы. У габрэйскім фальклоры ёсць цікавы эпізод з жыцця Майсея. Майсей сустрэў ў пустыні пастуха і правёў з ім цэлы дзень. Майсей дапамагаў пастуху даіць авечак і на схіле дня заўважыў, што той наліў найлепшае малако ў драўляную місу і паставіў яе на пляскатым

камені крыху наводдаль. Майсей спытаў пастуха, навошта ён гэта робіць. Той адказаў: «Гэта Божае малако». Майсей здзівіўся і папрасіў растлумачыць. Пастух адказаў: «Я заўжды бяру самае лепшае малако і прыношу яго як ахвяру Богу». Майсей, які быў больш адукаваны за пастуха з ягонай наіўнай верай, запытаўся: «І што, Бог п'е яго?». — «Так», — адказаў пастух. Тады Майсей вырашыў навучыць беднага пастуха і растлумачыць, што Бог ёсць чысты Дух, Які не п'е малака. Аднак пастух не згадзіўся і ўзнікала спрэчка; у выніку Майсей прапанаваў пастуху схавацца за кустамі і праверыць, ці сапраўды Бог прыходзіць выпіць малака. Майсей тым часам пайшоў маліцца ў пустыню. Пастух схаваўся; надышла ноч, і ў святле месяца пастух пабачыў лісяня, якое прыбегла з пустыні, агледзелася па баках, падскочыла да малака, выпіла яго і зноў знікла ў пустыні. На раніцу Майсей пабачыў пастуха вельмі сумным і панурым. «Што здарылася?» — запытваўся ён. Пастух адказаў: «Ты меў рацыю. Бог ёсць чысты Дух, і Яму не патрэбна маё малако». Майсей здзівіўся і сказаў: «Дык радуйся. Цяпер ты ведаеш пра Бога больш, чым раней». «Так, сапраўды, — кажа пастух, — але ж цяпер я страціў адзіны спосаб выказаць сваю любоў да Яго«. Майсей зразумеў; ён пайшоў у пустыню і там моцна маліўся. Уначы ён меў відзеж, Бог размаўляў з ім і сказаў: «Майсей, ты не меў рацыі. Я сапраўды чысты Дух. Аднак Я заўжды з удзячнасцю прымаў малако, якое пастух прыносіў мне як знак любові. Але ж паколькі Я чысты Дух і не п'ю малака, Я дзяліўся ім з лісяняткам, якому малако даспадобы».

Я стараюся давесці, па-першае, што малітва павінна быць звернута ўглыб нас самі́х, а не да Бога на нябёсах ці далёкага Бога, але да Бога, Які бліжэй, чым мы ўсведамляем; і па-другое, што першы крок у малітве — выбраць абсалютна праўдзівыя для нас словы, якіх мы не саромеемся, якія слушна нас адлюстроўваюць і нас вартыя, — і тады прапаноўваць іх Богу з усім разуменнем, на якое мы толькі здольныя. Таксама належыць укласці ўсё сваё сэрца ў гэты акт малітвы, шанавання і ўсхвалення Бога, у акт пяшчоты, які ёсць сапраўдная праява шчырай любові, дзеянне, якое цалкам ахоплівае розум, сэрца і цалкам адпавядае нам, якія мы ёсць.

Такім чынам, першае, што я прапаноўваю, гэта запытаць сябе, якія словы малітвы вам здаюцца вартымі таго, каб прынесці іх Богу; не важна, ці гэта вашыя ўласныя словы, ці словы іншых людзей. Запытайце сябе таксама, наколькі яны кранаюць ваша сэрца, наколькі вы можаце засяродзіцца на іх, — бо калі вы самі не здольны быць уважлівымі да таго, што кажаце, чаму Бог мусіць на гэта зважаць? Як Ен можа прыняць словы як праяву любові, калі вы не ўкладаеце ў іх усяго сэрца, калі вы ўклалі ў іх толькі драбніцу ветлівасці і столькі ж няўважлівасці?

І тады, як вы ўжо навучыцеся маліцца выбранай малітвай у спрыяльны час, калі вы зможаце прынесці Богу малітву, аддаўшы Божай прысутнасці ўсю ўвагу, паступова ўсведамленне Бога будзе ў вас расці. Яно стане настолькі моцным, што, незалежна ад таго, знаходзіцеся вы з людзьмі, слухаеце іх, размаўляеце ці працуеце ў адзіноце, нават побач з людзьмі вы будзеце здольныя маліцца. Аналогія,

якую праводзяць з гэтым нашы духоўныя аўтары, звычайна мае два ўзроўні: адзін больш грубы і просты, аднак трапны, і другі — больш вытанчаны.

Больш простае і грубае параўнанне прыводзіць выдатны духоўны настаўнік Феафан Затворнік: «Уведамленне Божай прысутнасці павінна быць ясным, як зубны боль». Калі баліць зуб, вы ні на хвіліну пра гэта не забываеце. Вы можаце размаўляць, чытаць, прыбіраць, спяваць ці рабіць што заўгодна, пры гэтым зубны боль прысутнічае пастаянна і вы не можаце на яго забыцца. Свяціцель кажа, што гэткім жа чынам мы павінны ўзгадаваць боль у сваіх сэрцах. Гаворка не пра фізічнае сэрца, але пра нашу сарцавіну і пра боль, які стане адчайным імкненнем да Бога, адчуваннем «Я адзін, а дзе ж Ён?» у момант, калі страчваецца сувязь у малітве.

Безумоўна, больш вытанчана гэта можна параўнаць з вялікай радасцю, вялікім смуткам і моцнымі пакутамі, пра якія мы памятаем цягам дня. Мы чуем людзей, працуем, чытаем, робім належнае, але боль страты, радасны ўспамін ці нахненне ад добрай весткі суправаджаюць нас няспынна. Такім павінна быць і адчуванне Божай прысутнасці. І калі адчуванне Божай прысутнасці настолькі яснае, чалавек можа маліцца аднасова з іншымі заняткамі. Можна маліцца падчас фізічнай працы, але таксама знаходзячыся з людзьмі, слухаючы ці размаўляючы. Аднак, як я казаў, гэтага не адбываецца з намі адразу, і спачатку мы павінны прывучыць сябе да стану малітоўнай увагі і скрушанага сэрца ў спрыяльных умовах, бо занадта лёгка зрабіцца няўважлівымі, саслізнуць у малітве

ад пільнасці да летуценнасці. Давайце будзем вучыцца вось такой малітоўнай уважлівасці, поўнай ураўнаважанасці, трымценню і пакорлівасці перад Богам у хвіліны, калі мы можам зрабіць гэта з сабраным розумам і сэрцам, а ўжо пасля можна спрабаваць так маліцца і ў іншых сітуацыях.

Мы працягнем разважаць пра гэта ў наступнай гутарцы на прыкладзе таго, як можна ўзяць адну ці дзве малітвы і з іх дапамогай прабіцца ўглыб да сябе, да месца, дзе ёсць Бог. Таксама я паспрабую растлумачыць, як можна скіроўвацца ўсярэдзіну, бо гэта праца іншага кшталту. І не забывайце пра лісяня — яно можа быць карысным для вашага малітоўнага жыцця. Раз ужо гаворка зачапілася за лісак, калі вы хочаце даведацца, як пасябраваць з Богам, павучыцеся ў іншага лісяняці — з кнігі Антуана дэ Сент-Экзюперы «Маленькі прынц» — як пасябраваць з кімсьці вельмі чуллівым, датклівым і сарамлівым.

На шляху ўглыб

Я адзначаў, што ўсе мы павінны сутыкнуцца з адной праблемай, якую трэба вырашыць: куды накіроўваць малітву? Я прапанаваў скіроўваць яе на саміх сябе. Пакуль ваша малітва да Бога не будзе важнай і змястоўнай найперш для вас саміх, данесці яе Госпаду вы не зможаце. Калі вы няўважліва ставіцеся да слоў, што прамаўляеце, калі сэрца не адгукаецца на іх ці калі вашае жыццё не паверну-та ў тым жа напрамку, што і малітва, яна не дасяг-не Бога. Таму ў першую чаргу, як я казаў, выбірайце малітву, якую вы можаце прамаўляць усім розумам, усім сэрцам і ўсёй воляй; малітву, якая не абавязкова з'яўляецца выдатным узорам літургічнага мастацт-ва, але якая павінна быць праўдзівай і змясціць усё, што вы хочаце выказаць. Вы павінны разумець гэ-тую малітву, усё яе багацце і дакладнасць.

Што датычыць ужывання слоў, то ёсць тры віды малітвы. Па-першае, мы можам маліцца самаад-вольна, сваімі словамі — такая малітва струменіць з нашых душ. Таксама можна ўжываць кароткія малітоўныя формулы, вельмі сціслыя, але надз-вычай моцныя зместам і такія неабсяжныя, што мо-гуць змясціць колькі заўгодна сэнсаў. Урэшце, мож-на карыстацца тым, што называюць, часам трохі грэбліва, «малітвамі-шпаргалкамі» — пачынаючы ад самых прымітыўных спроб скласці малітвы на ўсе выпадкі жыцця і сягаючы да глыбіннага досве-

ду святых, адлюстраванага ў малітвах, не імі самімі прыдуманых, але адбітых у іх жыццях і сэрцах Святым Духам. Цяпер колькі слоў пра кожную з іх.

Самаадвольная малітва сваімі словамі магчымая ў двух выпадках: у хвіліны, калі яснае ўсведамленне Бога ў адказ выклікае ўсхваленне Яго, радасць, любую рэакцыю, на якую мы толькі здольныя, застаючыся самімі сабою і стоячы перад Жывым Богам; або калі мы апынаемся ў смяротнай небяспецы, усведамляючы якую, звяртаемся да Бога — і раптам крычым з глыбіняў роспачы і пакінутасці, а таксама ад адчування, што няма іншай надзеі на выратаванне — толькі Бог.

Абодва гэтыя выпадкі — два крайнія полюсы: з аднаго боку, мы бачым сябе ў роспачы, пакінутымі Богам, самотнымі, прагнем, але ніяк не праб'емся; з другога — цудоўна і нечакана сустракаемся з Богам, калі проста молімся, і неістотна, якімі словамі. Мы можам раз за разам паўтараць: «Радасць мая, радасць мая». Мы можам гаварыць што заўгодна, бо словы не важныя, яны проста падтрымліваюць настрой, выказваюць — недарэчна ці нават бязглузда — нашу любоў ці нашу роспач. Памятаеце ўрывак у Дабравесці пра Пераяўленне, калі Пётр кажа Хрысту: «Ці не паставіць нам тры шатры — для цябе, Майсея і Іллі?» У Евангеллі гаворыцца, што Пётр сказаў глупства, бо быў не ў сабе. Ён апынуўся перад нечым настолькі надзвычайным, што выгукнуў першае, што прыйшло ў галаву, ляпнуў тое, што перадало ягоныя пачуцці.

Мы падманваемся, як дзеці, думаючы, быццам здольныя падтрымліваць вольную малітву ця-

гам усяго жыцця. Вольная малітва сваімі словамі павінна прабіцца з нашых душ, нельга проста адкрыць кран — і яна паліецца. Яе не атрымаць у любую хвіліну. Яна струменіць з глыбіняў душы, з цуду ці з гора, але не з чагосьці сярэдняга, калі нас не ахоплівае ні Божая прысутнасць, ні ўсведамленне, хто мы ёсць і якое наша становішча. Спроба скарыстацца вольнай малітвай у такія хвіліны — марнае практыкаванне. Бываюць цэлыя перыяды, калі вы не на дне марскім, не на вяршыні горнай, і, каб памаліцца, трэба прыкласці намаганне. Гэта і ёсць той час, калі вы не можаце маліцца нязмушана, але можаце маліцца толькі з пераканання. Гэта надзвычай важна, бо шмат людзей, якія толькі пачынаюць малітоўнае жыццё, лічаць, што пакуль яны не адчуюць поўнай перакананасці ў прамоўленых словах, яны няшчырыя. Гэта няслушна. Часам можна быць зусім шчырым — у яснасці розуму, у мэтанакіраванасці волі, але ў пэўны момант словы ці нават учынкі не будуць перадаваць таго, што чалавек адчувае.

Прыгадваецца такі прыклад. Вось вы жывяце разам з сям'ёй і ходзіце на цяжкую працу, з якой вяртаецеся дамоў фізічна знясіленымі. Калі ў гэты момант маці, сястра, бацька ці нехта яшчэ запытае: «Ты мяне любіш?», вы адкажаце: «Люблю». Калі б гэты чалавек працягваў дапытвацца: «Ты сапраўды мяне любіш вось цяпер?» — вы маглі б шчыра адказаць: «Не, я адчуваю толькі, як баліць спіна і ные цела». Але будзе чыстай праўдай, калі вы скажаце: «Я люблю цябе», бо ведаеце, што пад усёй гэтай знямогай ёсць жывая плынь любові. І калі Хрыстос гаворыць:

«Хто любіць Мяне, будзе выконваць запаведзі Мае», Ён не кажа: «Калі Мяне палюбіце, то пяройдзеце ад адной эмоцыі да іншай, памяняеце адно захапленне на іншае, адзін багаслоўскі погляд на іншы». Ён проста гаворыць: «Калі вы верыце Маім словам, жывіце годна, у адпаведнасці з тым, што атрымалі», а «годна» — значыць заўсёды крыху перасягаючы ўласныя магчымасці, робячы больш, чым бы вы зрабілі без свядомых высілкаў.

Такім чынам, патрэбна малітва, адрозная ад самаадвольнай, стыхійнай, але якая вынікае з перакананасці. Тут у дапамогу — безліч наяўных малітваў. У нас ужо ёсць на ўзбраенні багата іх, выпакутаваных падзвіжнікамі веры, выкаваных Духам Святым. Напрыклад, ёсць псалмы; у літургічнай скарбніцы розных Цэркваў, з якой мы можам чэрпаць, ёсць безліч кароткіх і доўгіх малітваў. Важна запомніць і ведаць такія малітвы, каб ў патрэбную хвіліну знайсці адпаведную. Гэта прадугледжвае завучванне на памяць дастатковай колькасці змястоўных для нас урыўкаў з псалмоў або з малітваў святых. Кожны чалавек чулы да нейкіх асаблівых урыўкаў. Адзначайце тыя, што западаюць вам у сэрца, узрушаюць глыбіні, даюць разуменне, выказваюць нешта — ці то грахоўнасць, ці то шчаснасць, ці то барацьбу, — што ўжо ёсць у вашым досведзе. Завучыце іх, бо аднойчы, у глыбокай роспачы, зусім бездапаможныя, вы не дасце рады спарадзіць ніякага выразу ці фармулёўкі, якія б самі вырываліся з вашай душы, і тады вы адкрыеце, што завучаныя словы прыходзяць як дарунак Бога, дарунак Царквы, дарунак святасці, дапамагаючы нашай

немачы. Вось тады насамрэч і спатрэбяцца малітвы, якія вы запомнілі і зрабілі часткаю саміх сябе.

У Праваслаўнай Царкве ёсць ранішнія і вячэрнія малітвы, у цэлым даўжэйшыя за звычайныя для Захаду. Чытанне гэтых малітваў займае прыкладна паўгадзіны раніцою і столькі ж ўвечары. Нехта будзе старацца завучыць іх на памяць, каб карыстацца імі ў іншыя моманты. Але завучванне недастаткова. Малітва мае сэнс толькі тады, калі яна пражытая. Пакуль малітвы не пражытыя, пакуль жыццё і малітва цалкам не пераплеценыя, малітвы будуць кшталту ветлівага дыфірамба, які мы ўзносім Богу, калі знаходзім для Яго час.

Калі ў ранішняй малітве вы прамовілі фразу, то павінны жыць згодна з ёй цягам дня. Я лічу, што, апроч завучвання як мага большай колькасці ўрыўкаў, трэба завесці такое правіла: адкрыўшы нейкае выслоўе, поўнае сэнсу асабіста для вас, — з Дабравесця, з Новага ці Старога Запаветаў, са слоў літургіі — трэба намагацца ўвесь астатні дзень, як найдаўжэй, няўхільна гэта выконваць. Толькі здаецца, што можна выбраць такую фразу і жыць ёю ўвесь дзень, але насамрэч гэта надзвычай складана. Калі вы здолееце няўхільна трымацца аднаго сказа нейкай малітвы цэлую гадзіну — гэта ўжо поспех, але паспрабуйце! Скажыце сабе: «Вось я прачытаў малітву «Гатовае сэрца маё, Божа, гатовае сэрца маё»[1] і буду на працягу паўгадзіны сваім жыццём пацвярджаць, што сэрца маё адкрытае Богу і гатовае слухацца Ягонай волі». Паўгадзіны, не болей, — потым

[1] Псалом 107 (108) «Песня надзеі на Бога» (перакл. В.Сёмухі. — Заўв. рэд.).

дайце сабе перадыхнуць і звярніцеся да чагосьці іншага, бо калі высільвацца, жыць адпаведна адна-му выслоўю, катэгарычнаму і цяжкавыканальнаму, у выніку вы проста скажаце сабе: «Усё, не магу», і скончыцца тым, што вы наогул нічога не будзеце рабіць. Але калі сказаць: «Вось у мяне тры-чатыры сказы на гэты дзень, і я буду старацца жыць імі: першым да дзясятай раніцы, потым перайду да на-ступнага і так далей»; тады вы пабачыце, што па-ступова ўсе словы, усе думкі і пачуцці, якія святыя выказваюць у сваіх малітвах, ажываюць унутры вас, яны пачынаюць уздзейнічаць на вашу волю, і яна пачынае прасякацца і фарміравацца імі, а так-сама і ваша цела, — бо жыць па запаведзях але-жыць з дапамогай цела.

Аднак вы можаце сказаць: «Гэтыя словы не кра-наюць мяне дастаткова моцна». Калі словы пера-даюць ваша грунтоўнае перакананне, але ў гэты момант вы нічога не адчуваеце, звярніцеся да Бога ў пакаянні, скажыце: «Вось тое, у што я глыбока веру, але бачыш, я ніяк гэтага не адчуваю». І тады вы, магчыма, адкрыеце ў сабе нечаканы парыў самаад-вольнай малітвы, праз якую вы выкажаце Богу смут-так, пакуты, агіду да саміх сябе, і вернецца ваша ра-шучасць сказаць Богу праўду, а таксама засведчыць, што ваша воля адзіная з Ягонай.

І апошні спосаб маліцца — гэта няспынна, наколькі магчыма, паўтараць малітоўныя заклікі, якія служаць апірышчам, фонам цяперашняга дня і ўсяго жыцця. Я зараз маю на ўвазе адметную праваслаўную практыку — вядомую нам Ісусаву малітву, што засяроджваецца на імені Ісуса Хры-

ста: «Госпадзе, Ісусе Хрысце, Сыне Бога, памілуй мяне грэшнага(-ую)». Гэтак моляцца пераважна манахі і манахіні, але таксама і міране. Гэта малітва ўстойлівасці, бо яна не плынная, калі думкі перацякаюць адна ў другую, але гэтая малітва ставіць нас твар у твар з Богам у вызнанні веры ў Яго і вызначае наша ўласнае становішча. Такое вызнанне веры, паводле большасці праваслаўных падзвіжнікаў і містыкаў, — гэта падсумаванне ўсяго Дабравесця. Мы вызнаём, што Хрыстос — Госпад; вызнаём Яго-ную паўнамоцную ўладу над намі, факт, што Ён — наш Госпад і наш Бог, а значыць, усё нашае жыццё знаходзіцца ў Ягонай волі і мы прызначаем сябе толькі Ягонай волі. Менавіта праз імя «Ісус» мы вызнаём сапраўднасць Уцялеснення і ўсяго, што Уцялесненне азначае. Далей, найменне «Хрыстос», у якім мы бачым Уцялесненае Слова Божае, згодна са Старым і Новым Запаветамі, Памазанніка Ягвэ. Потым — дасканалае вызнанне веры ў тое, кім Ён з'яўляецца — Сынам Божым. Гэта не толькі вызнанне веры ў Ісуса Хрыста, але падыход да Тройцы: бо Ён — Сын Айца, і ніхто не можа вызнаць у прароку з Галілеі Уцялесненага Сына Божага, калі толькі не навучыць яго Дух Святы бачыць, разумець і даручаць сябе Яму. І гэтае чацвёртае вызнанне веры дазваляе нам стаяць твар у твар з Богам у праўдзе і вызнаваць Яго духам. І нарэшце — «памілуй нас». «Госпадзе, памілуй» па-грэчаску гучыць як «Kyrie eleison».

Я настойваю менавіта на гэтых словах малітвы з тае прычыны, што ва ўсіх сучасных мовах, у параўнанні са старажытнымі, значэнне слоў ста-

ла больш вузкім, канкрэтным. Часта мы ўжываем надзвычай багатыя словы малітвы, не заўважаючы глыбіні таго, што прамаўляем, бо прымаем словы за тое, што яны значаць у нашай звычайнай гаворцы. А яны б маглі глыбока адгукацца ў нашых сэрцах, калі б мы толькі злучылі іх з тым, што яшчэ нам вядома.

Можа, мой прыклад збянтэжыць знаўцаў класічных моў, бо з філалагічнага пункту гледжання ён даволі сумніўны, але паколькі грунтуецца на гульні слоў, прыдуманай даўным-даўно грэчаскімі святымі айцамі, якія ведалі сваю мову і не саромеліся такой гульні, я таксама скарыстаюся ёй. Многія з нас калі-нікалі ўжываюць выраз «Госпадзе, памілуй» («Kyrie eleison»), прынамсі ведаюць пра яго існаванне і маюць прыблізнае ўяўленне пра яго значэнне. Так мы звяртаемся да Бога па міласць, спачуванне, сардэчную цеплыню. Даследчыкі старажытных моў могуць папракнуць мяне і грэчаскіх айцоў, бо некаторыя з іх выводзяць eleison з таго ж кораня, што і грэчаскія словы «алей», «аліўка», «дрэва аліўы». Але пакінем спрэчку даследчыкам і звернемся да таго, што на гэты конт можа даць нам Пісанне. Прамаўляючы «Госпадзе, памілуй», «Kyrie eleison», можна задаволіцца ім як агульным зваротам да Божай міласэрнасці. Але ў такім разе малітва нас не спатоліць, бо немагчыма ўкласці цалкам ўсё нашае жыццё ў такое «Госпадзе, памілуй», бо ў нашай штодзённай гаворцы самі гэтыя словы значаць няшмат. А вось калі прыгадаць аліўкавае дрэва, аліўку ў Старым і Новым Запаветах, адкрыецца наступнае: аліўка і аліўкавае дрэва ўпершыню з'яўляюцца

напрыканцы Патопу, калі голуб прыносіць галінку Ною. (Ці не той самы гэта голуб, што лунаў над Ісусам, калі Ён хрысціўся?) Галінка алівы сведчыць, што гнеў Божы вычарпаны, што чалавек атрымаў прабачэнне і што перад ім адкрываюцца новыя магчымасці і новы час. Гэта першы выпадак. Аднак прытрымлівацца такога шляху пастаянна не ўдасца, бо недастаткова проста мець час і новыя адкрытыя магчымасці, калі наша сэрца хворае, воля зламаная, або калі мы ні розумам, ні сэрцам не здольны ні бачыць шлях, ні ісці па ім — нам патрэбна ацаленне. Таму ўспомніце, як добры самарыцянін памазаў алеем раны абрабаванага чалавека. Гаючая Божая сіла дазволіць нам скарыстацца тым, што Ягоны гнеў аціх, а замест былі атрыманыя прабачэнне, дарунак часу, прасторы і вечнасці.

Яшчэ адзін вобраз — гэта памазанне святароў і цароў, якія былі пакліканыя з народа Ізраіля стаяць на мяжы Боскага і чалавечага светаў, паміж еднасцю і гармоніяй Божай волі ды разнастайнасцю і складанасцю чалавечага свету з усімі ягонымі звадамі і канфліктамі. Каб выстаяць на гэтай мяжы, чалавеку патрэбны звышчалавечыя здольнасці — яму патрэбна ласка Божая. Гэты сэнс і закладзены ў памазанне святароў і цароў. Але ў Новым Запавеце ўсе мы — святары і цары, і наша пакліканне як людзей і як хрысціян перавышае тое, чаго можа дасягнуць чалавек. Мы пакліканы стаць і быць жывымі членамі Цела Хрыстовага, храмамі на чыстай і вартай Святога Духа зямлі, далучанымі да Боскай прыроды. Гэта вышэй за нашы чалавечыя здольнасці, і ўсё адно нам трэба быць людзьмі напоўніцу, глыбінным чынам,

такімі, як хрысціянін бачыць чалавецтва ў вобразе Уцялесненага Сына Божага. У гэтым нам не абысціся без ласкі і дапамогі Божай. І гэта адлюстравана для нас у тым самым вобразе.

Такім чынам, калі б мы падумалі гэтак жа проста і непасрэдна — з дапамогай толькі слоўніка, Біблії і трошкі паразважаўшы — пра іншыя словы, якімі молімся, тады б яны значна ўзбагаціліся сэнсам. І мы б звярталі больш увагі на тое, што гаворым, і наша малітва не складалася б з пустых слоў альбо слоў-сімвалаў, сапраўдны сэнс якіх страчаны. І тады, перш чым казаць «Kyrie eleison» — «Госпадзе, памілуй мяне; Госпадзе, спагадай мне; Госпадзе, пралі на мяне Сваю любоў і пяшчоту», варта задумацца пра сваё становішча. Ці ўпалі мы на самае дно? А можа, стаім перад бясконцымі магчымасцямі, але разам з тым не ў стане ўсвядоміць ніводную з іх, бо глыбока параненыя? Ці мы ацаліліся, ды ўсё яшчэ стаім перад пакліканнем настолькі велічным, што саромеемся падумаць пра яго, бо яно вышэйшае за нас? Тым не менш яно можа быць спраўджана толькі тады, калі Бог дасць нам сілы. Гэта значыць, трэба ўважліва прачытваць словы, а таксама падыходзіць да іх так, каб яны сталі часткай нашых пачуццяў і вакол слоў збіралася і ўзмацнялася ўся засяроджанасць і глыбіня нашага асабістага жыцця. Але калі словы, якія мы ўжываем, не падмацоўваюцца ладам нашага жыцця, яны будуць заставацца бессэнсоўнымі і нікуды не прывядуць, быццам лук, які не страляе, бо не мае цецівы. Не мае сэнсу прасіць Бога аб тым, да чаго мы самі не гатовы. Калі мы кажам: «О Божа, збаў мяне ад той ці іншай спакусы», пры гэтым шу-

каем любой нагоды менавіта гэтай спакусе аддацца, спадзеючыся, што Бог усё кантралюе і што Ён нас выцягне, — тады ў нас анічога не атрымаецца. Трывалась нам дае Бог, але скарыстацца ёй павінны мы самі. Калі ў малітвах мы просім Бога даць нам моцы зрабіць нешта ў Ягонае Імя, то мы не просім Яго зрабіць гэта за нас, маўляў, мы дужа кволыя і бязвольныя, каб дзейнічаць самім.

У гэтым плане вельмі павучальныя жыццяпісы святых, напрыклад у жыціі Філіпа Неры, заходняга святога XVI стагоддзя, апавядаецца менавіта пра такі выпадак. Ён быў запальчывы чалавек, лёгка сварыўся і ўзбурваўся і, адпаведна, цярпеў выбухі гневу ад сваіх братоў па кляштары. Аднойчы ён вырашыў, што далей так працягвацца не можа. Ці было гэта праз цноту, ці ён проста болей не мог трываць сваіх братоў — ягонае жыціе нам не гаворыць. Атрымалася вось што: ён прыбег у капліцу, укленчыў перад статуяй Хрыста і пачаў маліцца, каб Той вызваліў яго ад уласнай гняўлівасці, і, поўны надзеі, выйшаў з капліцы. І вось ён сустрэў аднаго брата, які раней ніколі не выклікаў у яго ані каліва гневу, але ўпершыню ў жыцці гэты брат павёў сябе непрыязна і абразліва. Таму Філіп разгневаўся і, поўны лютасці, рушыў далей, каб пабачыцца з іншым братам, які заўсёды быў для яго крыніцай суцяшэння і радасці. Але нават той адказаў яму дзёрзка. Тады Філіп вярнуўся ў капліцу, упаў перад выявай Хрыста і выгукнуў: «О Госпадзе, хіба я цябе не прасіў вызваліць мяне ад гневу?» І Госпад адказаў: «Так, Філіпе, таму Я і памнажаю табе нагоды для навучання».

На маю думку, нам вельмі важна зразумець, што Бог будзе дзейнічаць менавіта так. Не ў Ягоных планах быць кожны дзень укрыжаваным за нас. У пэўны момант трэба ўзяць свой уласны крыж. Кожны з нас павінен узяць свой крыж, і калі мы просім нечага ў сваіх малітвах, то мусім самі ўзяцца за справу з усёй сваёй трываласцю, усім розумам і ўсім захапленнем, якія мы толькі можам укласці ў свае дзеянні, і з усёй мужнасцю і энергіяй, якія маем. Апроч таго, мы робім гэта з усёй магутнасцю, якую Бог даруе нам. Але калі мы так не робім, то толькі марнуем час у малітве. Гэта значыць, што «Госпадзе, памілуй» ці іншыя падобныя словы, якія мы можам прамаўляць, павінны быць скіраваны супраць нас самі́х. Розум наш павінен быць сфарміраваны і поўны словамі, быць адпаведны словам і знаходзіцца ў гармоніі з імі. Наша сэрца павінна з канчатковым пераканнем прымаць іх і вымаўляць з усёй стойкасцю, на якую мы толькі здольныя, а наша воля павінна завалодаць імі і пераўтварыць у дзеянне. Вось чаму малітва і дзеянне павінны стаць дзвюма праявамі нашага стану перад Богам і перад самімі сабой, і перад усім, што навокал нас. Пакуль гэтага няма, мы марнуем час. Які сэнс жаліцца Богу на праблемы, а потым, калі Ён дасць нам моц змагацца з імі, усесціся і чакаць, пакуль Ён Сам усё за нас зробіць? Які сэнс у паўтарэнні слоў, такіх схуднелых і бессэнсоўных, што яны прыдатныя адно толькі для пляцення павуціння паміж намі і Богам?

Таму выбірайце слушныя словы, выбірайце іх і засяроджвайце ўсю вашу ўвагу на іх, бо гэта словы праўды і словы, якія Бог пачуе, таму што яны

сапраўдныя. Укладзіце усё ваша сэрца ў іх. Прымусьце гэтыя словы ажыць ў інтэлектуальнай свядомасці праз іх сапраўднасць, і хай яны прабяруцца да самых глыбіняў вашага сэрца.

Словы малітвы — гэта заўсёды словы прысягі. Нельга проста прамаўляць малітоўныя словы, каб пры гэтым не мець на ўвазе: «Калі я кажу гэта, тады я і збіраюся гэта ажыццявіць, як толькі спатрэбіцца». Кажучы Богу: «Любой цаной, любой цаной, Госпадзе, выратуй мяне», памятайма, што для гэтага трэба сабраць усю сваю волю, бо аднойчы Бог скажа: «Вось тая цана, якую ты маеш сплаціць». Старажытныя казалі: «Дай сваю кроў, і Бог дасць табе Дух». Вось яна, цана. Адмоўся ад усяго — атрымаеш нябёсы; адмоўся ад прыгону — набудзеш свабоду. Бо воля ўжо ўцягнутая не толькі ў справу малітвы, але і ва ўсе яе вынікі; пагатоў і цела, бо чалавек — гэта не проста душа, заручоная з целам часова. Гэтая цэласнасць, якая з'яўляецца і целам, і душой, адной-адзінай істотай, — гэта і ёсць Чалавек.

У малітве трэба прыкладаць і цялесныя намаганні, цялесную ўважлівасць, трэба маліцца таксама і фізічна. У тым ліку трэба пасціць, калі ежа зрабіла вас занадта цяжкімі для малітвы. Калі рабіць так, то гэта і будзе стуканнем у дзверы.

Калі мы разам з усімі гэтым словамі спрабуем заглыбляцца ўсё больш і больш, падобна бурэнню свідравіны ў зямной кары, каб дабрацца да карысных выкапняў у нетрах, трэба адважыцца на рызыку, якая заключаецца ў тым, што паглыбляцца надзвычай складана. Гучыць проста. Усе мы лічым сябе глыбокімі і думаем, што, чым болей паглыбімся, тым

большая асалода нас чакае. Але гэта не так проста. Так, да пэўнай ступені ўсё як мае быць, але ў працэсе падарожжа ўсё пачынае нагадваць пошукі зачараваных скарбаў ці папараць-кветкі. На нашым шляху нам будуць сустракацца ўсялякія пачвары, але гэтыя пачвары — не цмокі ці лесавікі, не нашы бліжнія, яны — гэта мы самі. Вось што робіць паглыбленне непрыемным і ўскладняе яго.

Звычайна жыць навонкі нас змушаюць хцівасць, страх і пустая цікаўнасць. Алексіс Карэль, французскі навуковец, які працаваў у Амерыцы, у кнізе «Гэты незнаёмец чалавек»[1] адзначаў, што калі чалавек запытаецца ў сябе, дзе сканчаецца яго асабовасць, то пабачыць наступнае: язык хцівага выцягваецца, быццам шчупальцы, імкнучыся да ўсяго ядомага на свеце; вочы нездарова цікаўнага, таксама нібы шчупальцы, выпрастваюцца і прысмоктваюцца да ўсяго навокал; вушы віжа становяцца выцягнутымі і шырокімі, як лакатары, і сягаюць удалячынь. Калі б намаляваць, да каго тады падобен чалавек, то можна было б пабачыць, што ўнутры яго засталася толькі драбніца каштоўнага, бо ўсё астатняе звернута вонкі. Таму першае, што кожны павінен зрабіць, гэта адчапіць шчупальцы і ўцягнуць іх усярэдзіну. Немагчыма заглыбіцца, пакуль ты застаешся звонку.

Паспрабуйце, і вам на шляху адкрыецца яшчэ шмат карыснага. Знайдзіце час застацца сам-насам з сабою: зачыніце дзверы ў пакой і, калі вам не трэба больш нічога рабіць, супакойцеся. Скажыце: «Я цяпер з самім сабою» і проста сядзіце так. Надзіва хутка вы, верагодна, пачняце нудзіцца. Гэта вучыць нас

[1] Alexis Carrel, L'homme, cet inconnu (1935)

адной вельмі карыснай рэчы: мы ўсведамляем, што, калі мы так сябе адчуваем праз дзесяць хвілін адзіноты з самімі сабою, не дзіва, што іншыя пагатоў адчуваюць сябе з намі гэтак жа нудна. Чаму так адбываецца? Бо ў нас амаль нічога няма, каб прапанаваць сабе самім у якасці ежы для роздуму, эмоцый і жыцця. Калі ўважліва ўгледзецца ў сваё жыццё, дастаткова хутка можна пабачыць, што мы амаль ніколі не жывём знутры навонкі, замест гэтага мы адгукаемся на ўзбуджэнне і ўзрушэнне, на стымул. Інакш кажучы, наша жыццё — гэта адказ, рэакцыя. Нешта адбываецца — і мы рэагуем; нехта гаворыць — і мы адказваем. Але калі мы застаёмся без чаго-небудзь, што б заахвочвала нас думаць, гаварыць ці дзейнічаць, то ўсведамляем, што ўнутры нас няма нічога, што б увогуле схіляла нас да дзеяння хоць у якім кірунку. Гэта сапраўды вельмі драматычнае адкрыццё. Мы зусім пустыя, мы не дзейнічаем знутры саміх сябе, але прымаем за сваё жыццё тое, што насамрэч падсілкоўваецца звонку; мы прызвычаіліся да таго, што адбываецца і вымушае нас рабіць нешта. Зусім не часта ў нас атрымліваецца жыць толькі глыбінёй і багаццем, якія, як мы мяркуем, маем унутры сябе.

У Дыкенса, у «Запісках Піквікскага клуба», ёсць урывак, які вельмі добра апісвае маё жыццё; верагодна, гэтае апісанне падыходзіць і да вашага жыцця таксама. Піквік выпраўляецца ў клуб. Ён ловіць фурманку і па дарозе закідвае фурмана пытаннямі, у тым ліку: «Слухайце, як гэта магчыма, што такая ўбогая і кволая кляча можа цягнуць такую грувасткую і цяжкую фурманку?« На што рамізнік адказвае: «Справа не ў кані, сэр, а ў колах». А на

ўдакладненне Піквіка, што маецца на ўвазе, фурман тлумачыць: «Разумееце, у нас цудоўная пара колаў, яны так добра змазаныя, што варта каню трохі зварухнуцца, і колы закруцяцца, і тады яму, беднаму, больш нічога не выпадае, як бегчы, ратуючыся». Паглядзіце, як мы жывём амаль увесь час: не як конь, які цягне воз, мы рыхтык коні, што бягуць ад павозкі, баючыся за сваё жыццё.

Бо мы яшчэ не ведаем, як дзейнічаць без вонкавай прычыны, мы ўсведамляем сваё няведанне таго, што нам рабіць з сабою, і тады ўсё больш і больш нудзімся. Таму ў першую чаргу трэба навучыцца сядзець у адзіноце і прымаць гэтую нуду, робячы слушныя высновы.

Праз некаторы час адчуванне становіцца яшчэ горшым за нуду, бо нам не проста сумна, каб сказаць: «Я дзейны чалавек і карысны для свайго суседа. Я заўсёды раблю дабро, і таму для мяне знаходзіцца ў стане нявызначанасці, калі я нічога не раблю для кагосьці іншага, цяжкое выпрабаванне». Мы пачынаем адкрываць нешта іншае. Нам сумна, і мы спрабуем выбрацца з гэтай маркоты, паглыбляючыся ў сябе, каб знайсці ўсярэдзіне нешта, што спыніць яе. Вельмі хутка мы бачым, што нічога такога няма, бо мы ўжо не раз абдумалі ўсё, што мелі абдумаць. Увесь дыяпазон пачуццяў у нас у запасе — нібы закрытае піяніна; бо нам нязвыкла, што піяніна можа іграць само. Нам неабходны нехта, хто зайграе па клавішах. Нічога не рабіць нам нязвыкла, і таму гэта выклікае неспакой і нават даводзіць да тугі. Калі вы пачытаеце айцоў-пустэльнікаў, а ў іх у гэтым быў багаты досвед, ці манахаў, якія правялі сваё жыццё

ў манастыры, то пабачыце, што ў пэўныя моманты яны проста выбягалі са сваіх келляў і крычалі гвалтам, абы сустрэць каго ці што заўгодна. Нават сам чорт быў бы лепшы за гэтую пустэчу самасузірання. Адзін з духоўных аўтараў, Феафан Затворнік, піша: «Большасць людзей — нібы габлюшка, закручаная вакол пустэчы ў сярэдзіне». Па шчырасці, трэба прызнаць, што такое апісанне стану амаль кожнага з нас надзвычай трапнае.

Апроч гэтага, трэба перасіліць тугу і сказаць: «Не, я не адступлюся, я дайду да пункта, дзе сама туга падштурхне мяне зрабіць тое, чаго не можа нават добрая воля». Сапраўды, прыходзіць імгненне, хвіліна роспачы, тугі і жаху, і гэта прымушае нас накіравацца яшчэ глыбей усярэдзіну і маліць: «Госпадзе, памілуй! Я гіну, Госпадзе, ратуй мяне!» Мы пачынаем бачыць, што ўнутры нас няма нічога, што можа даць жыццё ці, хутчэй, з'яўляецца жыццём; а ўсё, што мы называлі жыццём, усё, што мы ўяўлялі як жыццё, знаходзілася звонку, а ўнутры не было нічога.

Тады мы ўглядаемся ў гэтую бездань нябыту і адчуваем, што, чым далей мы заглыбімся ў яе, тым менш ад нас застанецца. Гэта момант небяспекі, момант, калі мы павінны завагацца.

Тут дасягаецца першы ўзровень глыбіні, дзе мы ўжо можам пастукацца ў дзверы. Бо на ўзроўні, дзе мы проста адпачывалі ад нашага бліжняга, пакуль не занудзіліся; на ўзроўні, дзе нам проста сумна і мы раздражнёныя тым, што змушана тужым; на ўзроўні, дзе мы пачынаем коўзацца і мітусіцца, а потым прыходзіць лёгкая туга, у нас яшчэ няма

грунтоўных падстаў галасіць і крычаць у роспачы, якая апаноўвае ўвесь розум, усё сэрца, усю волю і ўсё наша цела адчуваннем, што калі Бог не прыйдзе, я прапашчы і не маю надзеі, бо ведаю: калі падымуся з гэтай глыбіні, то проста вярнуся ў сферу падманлівай мроі, адлюстраванага, але не сапраўднага жыцця.

У гэту хвіліну мы можам пачаць стукацца ў дзверы, якія пакуль зачынены, але за якімі ёсць надзея, тая надзея, якую сляпы Вартымей адчуў каля брамы Ерыхона — праз сваю надзвычайную роспач, ад таго, што Хрыстос праходзіў міма.

З Новага Запавету мы ведаем, што Вартымей сядзеў на зямлі пры дарозе, невылечна сляпы, зусім страціўшы веру і надзею на дапамогу людзей. Ён дайшоў да жабрацтва, да спадзявання не на сапраўдную міласць, але на міласціну — якая ў тым, каб кінуць капейчыну некаму, на каго нават і не зірнулі. І аднойчы гэты чалавек, які ўжо адмовіўся ад надзеі, увесь у дарожным пыле, у сваёй відавочнай слепаце, пачуў пра Чалавека, новага Прарока, Які тварыў цуды па ўсёй Святой Зямлі. Меў бы ён вочы, то ўзняўся б і пашыбаваў праз увесь край, каб знайсці Яго, але яму, гэтаму Вартымею, хіба ж угнацца за вандроўным цудатворцам? Так ён застаўся на месцы, а веданне пра існаванне чалавека, які мог бы ацаліць яго, пэўна, толькі яшчэ больш абвастрыла і без таго горкую роспач. І вось аднойчы ён пачуў, што міма праходзіць натоўп, грамада, якая гучыць, як ніводная іншая. Пэўна, як гэта звычайна ў невідушчых, у яго развіўся больш востры за наш слых і адчувальнасць, і ён

спытаў: «Хто там ідзе?». І пачуў у адказ: «Ісус з Назарэта». У гэты момант Вартымей апынуўся на памежжы найбольшай роспачы і найвялікшай надзеі. Найвялікшай надзеі, бо Хрыстос праходзіў вось тут, зусім блізка; але была блізка і цьмяная роспач, бо вось — некалькі крокаў, і Ён мог параўняцца з Вартымеем, а яшчэ некалькі крокаў — і ўсё, Ён ужо прайшоў міма і больш ніколі не вернецца. І ад гэтай надзеі, поўнай роспачы, ён пачаў плакаць і галасіць: «Ісусе, сыне Давідаў, памілуй мяне». Гэта было сапраўднае вызнанне веры. Яно прыйшло тады, бо роспач была такой глыбокай, што яна выклікала аж настолькі смелую надзею — на выратаванне, на ацаленне, на тое, каб стаць цэлым. І Хрыстос пачуў.

Існуе такі ўзровень роспачы, звязаны з агульнай чыстай надзеяй, на якім, заглыбіўшыся ў сябе, мы зможам маліцца; тады цалкам дастаткова будзе і «Госпадзе, памілуй». Не патрэбны будуць красамоўныя распрацаваныя малітвы з малітоўніка. Досыць проста ў роспачы пракрычаць: «Памажы!» — і Ён вас пачуе.

Часта нам бракуе ў малітве напружанасці, перакананння і веры, бо наш адчай недастаткова глыбокі. Нам хочацца, каб Бог быў усяго толькі дадаткам да іншага, мы прагнем Яго дапамогі, але разам з тым шукаем яе дзе заўгодна, а Бога пакідаем як запасны варыянт. Мы звяртаемся да князёў і сыноў чалавечых і просім: «Госпадзе, дай ім сіл зрабіць для мяне тое і тое». Вельмі рэдка мы адразу звяртаемся да Самога Бога са словамі: «Я не шукаю дапамогі ні ў кога, але прашу толькі Тваёй падтрымкі». Калі наш адчай

ідзе з дастатковай глыбіні, калі тое, што мы просім, пра што плачам, настолькі важна, што перадае ўсе патрэбы нашага жыцця, толькі тады мы зможам знайсці словы малітвы і дасягнуць яе сутнасці — сустрэчы з Богам.

А цяпер скажу колькі слоў пра трывогу. І зноў успомнім пра Вартымея. Ён лямантаваў, а што гаварыцца ў Евангеллі пра людзей побач? Яны спрабавалі сцішыць яго, усе гэтыя набожныя здаровыя людзі з выдатным зрокам і цэлымі нагамі. Яны грамадой стаялі вакол Хрыста, вялі размовы пра высокае, пра надыход Царства і таямніцы Пісанняў, раз-пораз абарочваліся да Вартымея і загадвалі: «А ну змоўкні! Мы размаўляем пра Бога, а тут ты са сваёй слепатой». Вартымей быў зусім недарэчы са сваёй адчайнай мальбой падчас паважнай гутаркі. Яго б адразу выкінулі прэч і прымусілі сціхнуць. Але, паводле евангельскага аповеду, нягледзячы на ўвесь натоўп нядобразычліўцаў, ён стаяў на сваім, бо для яго гэта было надзвычай важна. Чым больш яго намагаліся суцішыць, тым гучней ён крычаў.

Вось што я хачу сказаць. Ёсць такі грэчаскі святы Максім. Аднойчы маладым чалавекам ён прыйшоў у царкву і пачуў апостальскае пасланне: «Несупынна маліцеся!». Яго гэта так уразіла, што ён вырашыў прысвяціць сябе выкананню гэтай запаведзі. Выйшаўшы з храма, ён адправіўся ў горы паблізу і пачаў няспынную малітву. Максім быў грэчаскім селянінам IV стагоддзя і ведаў толькі «Ойча наш» і некалькі іншых малітваў. Як пазней расказваў сам святы, гэтыя малітвы ён паўтараў зноў і зноў. І яму было вельмі добра. Ён маліўся, быў з Богам, адчуваў

узнёсласць і дасканаласць усяго навокал. Аднак надыходзілі прыцемкі, рабілася халаднейі, і пакрысе да яго пачалі далятаць трывожныя гукі — трэск галін пад лапамі дзікіх жывёл, стогн ахвяр драпежнікаў і розныя іншыя. Тады да яго прыйшло адчуванне поўнай адзіноты — ён маленькая, безабаронная істота ў свеце небяспекі, смерці і забойства, і толькі Бог можа дапамагчы яму. Ён кінуў чытаць «Ойча наш» і Сімвал веры і зрабіў тое, што і Вартымей — пачаў гукаць: «Госпадзе Ісусе Хрысце, Сыне Божы, памілуй мяне!». Так ён крычаў усю ноч, бо начныя звяры і бляск іх раз'юшаных вачэй не давалі яму заснуць. Раніцай, калі драпежнікі паснулі, ён падумаў: «Вось нарэшце можна маліцца», але адчуў голад. Ён вырашыў сабраць ягад і пайшоў у бок зарасніку, аднак хутка зразумеў, што ўсе тыя шалёныя вочы і драпежныя кіпцюры, відаць, хаваюцца недзе ў тых жа кустах. І ён пачаў ісці вельмі павольна, на кожным кроку кажучы: «Госпадзе Ісусе Хрысце, Сыне Божы, выратуй мяне, памажы мне, памажы мне. О Божа, абарані і захавай мяне», і за кожную сарваную ягаду ён, пэўна, маліўся не адзін раз.

Мінуў час, і праз шмат гадоў ён сустрэў сталага і дасведчанага аскета, які запытаў Максіма, як той навучыўся няспыннай малітве. Максім адказаў: «Я думаю, што няспынна маліцца мяне навучыў д'ябал». Аскет прамовіў: «Здаецца, я разумею, пра што ты кажаш, але хацеў бы пераканацца, што разумею слушна». Максім патлумачыў, як ён спаквaля прызвычаіўся да ўсіх гукаў і небяспек дня і ночы. Але потым яго пачалі апаноўваць спакусы: спакусы цела, розуму і пачуццяў, а пасля ўсяго яшчэ і жу-

дасныя напады д'ябла. Адгэтуль не было ні хвіліны дня і ночы, калі б ён не ўсклікаў да Бога: «Памілуй мяне, памілуй мяне, памажы, памажы мне». І вось аднойчы, праз чатырнаццаць гадоў такога жыцця, Госпад з'явіўся яму, і ўраз яго ахінулі цішыня, мір і спакой. Ад страху не засталося і знаку. Страх цемры, ці кустоў, ці д'ябла — усё Госпад ўзяў на сябе. «Тады, — кажа Максім, — я засвоіў сваю абсалютную і безнадзейную бездапаможнасць, пакуль Госпад не прыйдзе сам. Нават суцішаны, спакойны і шчаслівы, я працягваў маліцца: «Госпадзе Ісусе Хрысце, Сыне Божы, памілуй мяне». Максім ведаў, што толькі боская міласць дае мір у сэрцы, разважлівы розум, цялесны спакой і праведную волю.

Так Максім навучыўся маліцца, не проста нягледзячы на трывогу, але і дзякуючы ёй, бо ў ёй і была сапраўдная небяспека. Калі б мы ўсведамлялі, што насамрэч пагроза значна большая, што д'ябал толькі і пільнуе, каб злавіць і загубіць нас, што кожная сустрэча з чалавекам — гэта суд, крызіс, сітуацыя, у якой мы пакліканы альбо прыняць Хрыста, альбо быць Яго пасланнікамі да таго, з кім сустрэліся; калі б мы разумелі, што ўсё жыццё напоўнена менавіта такім сэнсам, тады б мы маглі маліцца няспынна і трывога была б не перашкодай, а галоўнай умовай, якая вучыць нас маліцца, пакуль мы яшчэ недастаткова дасведчаныя, каб маліцца з глыбіні без падказак ці стымулаў.

Як навучыцца маліцца ў тых умовах, у якіх мы жывём, калі мы нічога не ведаем пра малітву, калі мы ніколі ў жыцці не маліліся ці маліліся мала? Я эксперыментаваў з гэтым ў розных сітуацыях: як

лекар, пяць гадоў на вайне, святаром. Гэта працуе, калі праз меру не ўскладняць, наступным чынам.

Прачнуўшыся зранку, найперш падзякуйце за гэта Богу, нават калі надыходзячы дзень не асабліва вас радуе. «Вось дзень, што Госпад стварыў: узвесялімся і ўзрадуемся ў ім!» Затым спыніцеся, прачуйце сказанае, і хай яно будзе для вас праўдзівым — менавіта як глыбокае перакананне, а не павярхоўнае захапленне. Пасля ўстаньце, памыйцеся, адзеньцеся, зрабіце неабходныя справы і тады звярніцеся да Бога зноў з упэўненасцю ў дзвюх рэчах. Па-першае, вы належыце Богу, а па-другое, гэты дзень таксама належыць Богу, і ён абсалютна новы, непаўторны, якога раней ніколі не было. Яго можна параўнаць з некранутым снежным абшарам. Па ім яшчэ ніхто не ступаў, ён ляжыць перад вамі некрануты і чысты. І што далей? А далей папрасіце Бога блаславіць гэты дзень, каб Ён усё ў ім управіў. Таксама трэба гэта ўспрымаць вельмі сур'ёзна, бо часта мы кажам: «Божа, блаславі» і, атрымаўшы блаславенне, паводзім сябе, як блудны сын, — бяром усё сваё багацце, ідзём у далёкі край і вядзём распуснае жыццё.

Гэты дзень блаславёны Богам, належыць Яму. Пастарайцеся ўвайсці ў гэты дзень як Божыя пасланнікі: сустракайце кожнага, як сустрэў бы Бог. Вы павінны быць сведчаннем прысутнасці Бога, прысутнасці Хрыста, прысутнасці Духа, прысутнасці Дабравесця — вось ваша задача ў гэты канкрэтны дзень. Бог ніколі не абяцаў, што калі вы ўступіце ў сітуацыю дзеля імя Яго, то Ён зноў будзе на крыжы, а вы ўваскрэснеце. Важна быць гатовым

у любой сітуацыі дзейнічаць дзеля імя Божага, так, як бы дзейнічаў Сын Божы: у прыніжанасці і пакоры, праўдзе і гатоўнасці да пакут. Звычайна мы адразу чакаем цудоўную ўзнагароду за выкананне Божых запаведзяў — часам пра гэта можна прачытаць у жыціях святых. Калі, напрыклад, хтосьці б'е нас па адной шчацэ, мы падстаўляем другую, але ж наступнага ўдару зусім не чакаем, мы чакаем, што той чалавек усклікне: «Вось гэта пакора!», — і тады нам дастанецца ўзнагарода, і яго душа будзе збаўлена. Але так не бывае. Цана мае быць сплочана, і таму часта нам моцна дастаецца. Самае важнае — быць гатовым да гэтага. Калі мы прымаем, што кожны дзень блаславёны Богам, вылучаны Ім, тады кожны чалавек, якога мы сустракаем, будзе дарункам Божым, горкім ці салодкім, даспадобы ён нам ці не. Гэта дарунак ад Самога Бога для нас, і калі гэта ўспрымаць менавіта так, то можна прыняць любую сітуацыю. Але прыняць яе трэба з усведамленнем, што здарыцца можа ўсё што заўгодна, прыемнае і непрыемнае. І калі мы дзеля імя Божага ўваходзім у кожны новы дзень, які Ён Сам стварыў і блаславіў для нас, толькі тады можна з'яднаць малітву і жыццё як два бакі адной манеты. Маліцца і дзейнічаць, нібы на адным дыханні, бо ўсе жыццёвыя сітуацыі вымагаюць Божага блаславення.

Некалькі гадоў таму я гаварыў на гэтую тэму ў Тэзэ, а пасля перапісваўся недзе з трыццацю хлопцамі і дзяўчатамі адтуль. Адна дзяўчына напісала мне: «Я ўсё рабіла, як Вы раілі, намагалася з усіх сіл. Не было ні хвіліны, калі б я не малілася — што б я ні рабіла, я малілася. Але болей я не чую

слоў Бога, малітва стала для мяне невыноснай». Я адказаў ёй: «У цябе нястраўнасць. Да малітвы, як і да ўсяго ў жыцці, трэба ставіцца з цвярозым розумам. Не маліўшыся ніколі раней, нельга пачынаць з васямнаццаці гадзін такой бесперапыннай малітвы і гутаркі з Богам разам з іншымі жыццёвымі справамі. Але ж можна вылучыць пару момантаў і ўкласці ў іх усю сваю энергію і ўважлівасць. Проста ўздымі вочы да Госпада, усміхніся і пачні. Часам досыць проста сказаць Богу: «Мне нестае моцы быць з Табой увесь час, мне трэба адпачыць», і гэта будзе праўда. Ты ўсё яшчэ не можаш быць з Богам пастаянна. Дык проста скажы так. Бог выдатна гэта ведае, што б ты ні рабіла. Адыдзі, дазволь сабе на нейкі час крыху адпачыць і прымі, што ў гэты момант ты менш святая.

Такім чынам, мы можам адпачыць і паглядзець на рэчы, якія таксама належаць Богу — дрэвы і будынкі, — і пасля зноў вярнуцца да Яго. Калі мы паспрабуем маліцца няспынна, то вельмі хутка будзем пераможаныя, але ж, выбіраючы адпаведныя моманты, мы можам гэта зрабіць.

Калі вы будзеце рабіць так, то здолееце маліцца. Можна эксперыментаваць, але захоўваючы цвярозасць, таму што ёсць грэх, які святыя айцы называюць «духоўная сквапнасць». Гэта жаданне мець болей і болей стасункаў з Богам тады, калі карысна пабыць на «дыеце» і задаволіцца тым малым, што вам неабходна ў гэты момант.

Як управіцца з часам

Надзвычай важная праблема сучаснага напружанага жыцця — як арганізаваць час. Я не буду вас пераконваць, што часу ў вас дастаткова шмат, каб маліцца, калі вы толькі пажадаеце; я хачу пагутарыць пра тое, як кіраваць часам унутры напружання, у жыццёвай мітусні. Я не буду апісваць, як выкраіць час, я толькі скажу, што калі пастарацца і марнаваць трохі менш часу, то яго будзе больш. Калі сабраць разам драбніцы дарэмна патрачанага часу і скласці з іх кароткія моманты для разважлівасці і малітвы, акажацца, што часу ў нас даволі. Калі прыгадаць, колькі мы штодзённа маем пустых хвілін, у якія нешта робім толькі таму, што баімся пустэчы ці адчування самоты адзін на адзін з сабой, то стане зразумела, што ёсць шмат кароткіх імгненняў, якія могуць адначасова належыць і нам, і Богу. Але я хачу пагаварыць пра штосьці больш важнае — пра тое, як мы можам кантраляваць і спыняць час. Мы можам маліцца Богу, толькі калі мы ўсталяваліся ў стане раўнавагі і ўнутранага ладу твар у твар з Ім, і гэта вызваляе нас ад адчування часу — не аб'ектыўнага, за бегам якога мы сочым, — але суб'ектыўнага адчування таго, што час хуткаплынны і ў нас яго больш не застаецца.

Найперш я б хацеў звярнуць вашу ўвагу на тое, што ўсе мы ведаем і пастаянна абмяркоўваем: бегчы з часам навыперадкі, каб яго дагнаць, няма абсалют-

на ніякай патрэбы. Час не ўцякае ад нас, а бяжыць насустрач. Незалежна ад таго, ці ёсць у чалавека планы на наступную хвіліну ці ён зусім пра яе не дбае, усё адно яна надыдзе. Будучыня — і нічога з гэтым не паробіш — стане цяперашнім часам, і няма ніякай патрэбы спрабаваць пераскочыць з цяперашняга часу ў будучыню. Мы можам проста чакаць, каб яна надышла, і ў гэтым сэнсе можна быць абсалютна ўстойлівым і пры гэтым рухацца ў часе, бо сам час рухаецца. Вы ведаеце, як здараецца, калі едзеш машынай ці цягніком не за рулём, а сядзіш сабе і пазіраеш у акно: можна чытаць, можна думаць, можна проста адпачываць, а цягнік усё роўна рухаецца, і ў нейкі момант тое, што было будучыняй — ці наступны прыпынак, ці апошняя станцыя, да якой вы едзеце, — стане цяперашнім часам. І я думаю, што гэта вельмі важна. У нашым унутраным жыцці мы часта робім памылку, уяўляючы, быццам, калі спяшацца, мы будзем у будучыні хутчэй, падобна чалавеку, які перабягае з апошняга вагона цягніка ў першы, спадзеючыся ў выніку скараціць адлегласць паміж Лонданам і Эдынбургам. На такім прыкладзе відаць, наколькі гэта абсурдна, але калі мы працягваем жыць, штораз спрабуючы быць на крок наперадзе сябе саміх, то гэтай абсурднасці мы не заўважаем. Тым не менш акурат гэта і замінае нам быць цалкам у цяперашнім імгненні, якое, як я адважуся сцвярджаць, і ёсць адзінае імгненне, у якім мы толькі і можам быць, бо нават калі мы ўяўляем, нібы мы наперадзе часу ці наперадзе саміх сябе, то гэта не так. Ад таго, што мы спяшаемся, хутчэй мы не рухаемся.

Вы, бадай, не раз бачылі, як чалавек бяжыць з дзвюма цяжкімі валізамі, каб паспець на аўтобус: ён спяшаецца з усіх сіл, бяжыць так хутка, наколькі яму дазваляюць чамаданы, ён увесь у памкненні быць там, дзе ён не знаходзіцца. Але вы ведаеце, як бывае на прагулцы ў выхадны. Можна ісці шпаркім, спрытным і паспешлівым крокам, а ў адпаведным узросце і стане можна нават бегчы, але зусім не адчуваць спеху, бо ў гэты момант мае значэнне сам бег, а не тое, куды чалавек бяжыць. Менавіта гэтаму мы павінны навучыцца ў малітве: усталяваць ца ў цяперашнім часе. Зазвычай нам здаецца ці мы паводзім сябе, нібы цяперашні час — гэта нейкая ўяўная лінія паміж мінуўшчынай і будучыняй, па якой мы слізгаем з мінулага ў будучыню, пастаянна прамінаючы гэтую лінію, як калі б мы кацілі яйка па абрусе: яно коціцца несупынна, і яно нідзе не знаходзіцца ні ў які пэўны момант; няма цяперашняга часу, бо яно заўжды ў будучыні.

Не кожнаму шанцуе перажыць вызначальны вопыт, «сітуацыю раскрыцця», якая нечаму вучаць, дык я хацеў бы вам у некалькіх словах расказаць пра вельмі карысны досвед, які выпаў на маю долю.

Падчас нямецкай акупацыі Францыі я быў у Рэзістансе, руху супраціўлення, і аднойчы, калі я спускаўся ў метро, мяне схапіла паліцыя. Гэта адно з маіх самых цікавых перажыванняў. Пакідаючы ў баку ўсе рамантычныя падрабязнасці таго, што і як здарылася, я перавяду гэта ў больш філасофскае рэчышча — датычна часу. А адбылося вось што: у мяне было мінулае, у мяне была будучыня, і я рухаўся з першага ў другую шпаркім крокам уніз па сходах.

Знянацку нехта паклаў руку на маё плячо і сказаў: «Стаяць, прад'явіце дакументы». У гэтае імгненне здарылася некалькі рэчаў. Па-першае, я пачаў думаць вельмі хутка, адчуваць вельмі інтэнсіўна і разумець усю сітуацыю з такой рэльефнасцю і каляровасцю, якіх я яшчэ ніколі не адчуваў на апошніх прыступках станцыі метро «Этуаль». Па-другое, я ўсвядоміў, што ў мяне няма мінулага, бо ўсім сапраўдным мінулым было штосьці, за што я быў бы асуджаны на расстрэл. Дык вось, гэтага мінулага больш не было. Таксама ніколі не існавала і фальшывага мінулага, пра якое я падрыхтаваўся гаварыць, так што я аказаўся падобным да яшчаркі, якую схапілі за хвост і якая ўцякла, пакідаючы хвост недзе за сабой: дзе быў хвост, яшчарка і заканчвалася. Потым я ўсвядоміў яшчэ вельмі цікавую рэч (хоць у той момант я і не распрацоўваў філасофію часу дэталёва). Я адразу ўцяміў і паступова зразумеў яшчэ лепей: будучыня існуе толькі да той ступені, наколькі можна прадбачыць за хвіліну да таго, як яна адбудзецца, ці за сантыметр да таго, што мае адбыцца пасля... а потым нічога не будзе, бо ў вас няма ўяўлення, што б магло адбыцца. Гэта нібы чалавек стаіць у незнаёмым пакоі ў цемры. Стаіць, і ўсё, што навокал — гэта цемра, якая цісне на зрэнкі: можа быць, перад чалавекам няма нічога, а можа быць, перад ім бясконцасць — усё адно. Чалавек заканчваецца акурат там, дзе пачынаецца цемра. І вось я зразумеў, што і будучыні ў мяне таксама няма. І менавіта тады я спасціг, што немагчыма жыць ў мінуўшчыне ці будучыні, напросту немагчыма. У яшчаркі няма хваста, і цемра была на маім твары. Мне адкрылася, што я вымуша-

ны ўціснуцца ў цяперашні момант, і ўсё маё мінулае, усе рэчы, якія б маглі быць, сканцэнтраваны ў цяперашнім моманце з інтэнсіўнасцю, каляровасцю такой надзвычайнай яркасці, што гэта ў выніку і дапамагло мне выбрацца з цяжкага становішча!

Цяпер, калі казаць пра час, але не надта дэталёва, нехта можа ўспрыняць: вось ён, цяперашні момант — мінулае непапраўна сплыло, яно тычыцца справы толькі ў той ступені, наколькі яно ўсё яшчэ ў цяперашнім часе; будучыня ж не мае дачынення да справы таму, што яна можа адбыцца, а можа і не. Гэта здараецца, напрыклад, калі вы трапляеце ў няшчасны выпадак або калі вы ў небяспецы і трэба дзейнічаць надзвычай хутка. Вам няма калі плаўна перакочвацца з мінулага ў будучыню. Усё, што вам трэба, — гэта быць настолькі цалкам у цяперашнім часе, што ўся ваша энергія, уся ваша істота зводзяцца да слова «цяпер». Вы раптам усведамляеце, што знаходзіцеся ў «*цяпер*». Гэта нібы вельмі-вельмі тонкая паверхня, якая, як умоўная геаметрычная фігура, не мае ніякай таўшчыні. Гэтая абсалютна тонкая паверхня і ёсць «цяпер»; яна рухаецца ўздоўж лініі часу, ці, хутчэй, час бяжыць пад яе і прыносіць вам «цяпер» усё, што вам спатрэбіцца ў будучыні. Гэтаму мы павінны навучыцца, і навучыцца менш драматычна. Я думаю, нам трэба практыкавацца ў тым, каб спыняць час і заставацца ў цяперашнім часе, у гэтым «цяпер», якое з'яўляецца маім цяперашнім часам, а таксама пунктам перасячэння вечнасці з часам.

Напрыклад, першае практыкаванне. Яго можна праводзіць, калі вам абсалютна няма чаго рабіць,

калі нічога не цягне вас ні назад, ні наперад і калі вы можаце выкарыстаць пяць хвілін, тры хвіліны ці паўгадзіны для адпачынку і безрабоцця. Сядзьце і скажыце: «Я сеў, я нічога не раблю, я нічога не буду рабіць пяць хвілін», а потым расслабцеся і пастаянна цягам усяго гэтага часу (адна ці дзве хвіліны — гэта максімум, колькі вы здолееце вытрымаць напачатку) усведамляйце: «Я тут у прысутнасці Божай, у сваёй уласнай прысутнасці і ў прысутнасці ўсёй гэтай мэблі, што вакол мяне, проста спакойны, нікуды не рухаюся». Вядома, ёсць рэч, якую вы павінны зрабіць: вырашыць, што цягам гэтых дзвюх ці пяці хвілін, якія вы прызначылі для навучання існаванню цяперашняга часу, вас не вырве з яго тэлефон, званок у дзверы ці раптоўны прыліў энергіі неадкладна падхапіцца і перарабіць усё, што у вас назбіралася нязробленага за апошнія дзесяць гадоў. Вы ўладкаваліся і абвяшчаеце: «Вось я» — і вы ёсць. Калі вы навучыцеся так практыкавацца ў пустыя хвіліны свайго жыцця, калі вы навучыцеся не мітусіцца ўнутрана, але быць зусім спакойнымі ды шчаслівымі, устойлівымі ды ціхамірнымі, тады прадоўжыце гэтыя некалькі хвілін цішыні яшчэ крыху, а потым яшчэ трошкі. Безумоўна, прыйдзе імгненне, калі вам спатрэбіцца нейкае ахоўнае прыстасаванне, бо можна сядзець спакойна цягам дзвюх хвілін, нават калі звоніць тэлефон ці нехта грукае ў дзверы, але пятнаццаць хвілін могуць быць задоўгімі як для тэлефона, які звоніць, так і для чалавека, які чакае пад дзвярыма. Тады ўявіце сабе, што калі б вас не было дома, то вы б ні дзвярэй не адчынялі, ні трубку б не падымалі. А калі вы станеце

больш рашучымі і больш перакананымі, то можаце зрабіць, як мой бацька. Ён пакідаў на дзвярах маленькую запіску з паведамленнем: «Не стукайце, калі ласка. Я дома, але я не адчыню». Гэта нашмат больш эфектыўна, бо людзі разумеюць гэта адразу лепей, чым калі б вы казалі: «Калі ласка, пяць хвілінак». Больш як на дзве хвілінкі ласкі не хапае!

Пасля таго, як вы ўжо навучыліся гэтай устойлівасці, гэтай ціхамірнасці, трэба навучыцца спыняць час не толькі ў моманты, калі ён цягнецца альбо і так спыніўся, але і тады, калі ён імкліва бяжыць, калі ён выстаўляе патрабаванні. Зрабіць гэта можна так. Вось вы робіце нешта, што лічыце карысным; здаецца, калі гэтага не зрабіць, свет пахіснецца; але потым, калі ў нейкі момант вы скажаце «стоп», то вам адкрыецца шмат новага. Найперш выявіцца, што свет не пахіснуўся, што цэлы свет — толькі ўявіце сабе — можа пачакаць пяць хвілін, пакуль вы ім не займаецеся. Гэта важна, бо мы часта сябе падманваем, кажучы: «Ну, я павінен зрабіць гэта: гэта добрая справа, абавязак, я не магу кінуць, не дарабіўшы». Можаце! Бо калі вас апаноўвае лянота, вы кідаеце справу недаробленай нашмат даўжэй, чым на пяць хвілін, якія вы вылучылі. Таму першае, што вы павінны сказаць: «Што б ні здарылася, я спыняюся зараз». Самы просты спосаб так зрабіць — гэта паставіць будзільнік. Завядзіце яго і скажыце: «Я буду працаваць, не пазіраючы на гадзіннік, пакуль не зазвоніць будзільнік». Гэта вельмі важна; трэба развучыцца глядзець на гадзіннік. Калі вы ідзяце пешкі і бачыце, што спазняецеся, вы пачынаеце раз-пораз глядзець на гадзіннік. Але,

трымаючы свой позірк на запясці, нельга ісці гэтак жа шпарка, як калі проста глядзіш наперад. Няхай вы будзеце ведаць, ці на сем, ці на пяць, ці на тры хвіліны вы спазняецеся, ад гэтага вы не спозніцеся менш. Так што лепей выходзіць загадзя, каб быць своечасова. А калі вы спазняецеся, проста ідзіце як мага хутчэй і шпарчэй. А ўжо каля дзвярэй паглядзіце, якая ступень раскаяння павінна быць на вашым твары, калі адчыняцца дзверы. Потым, калі будзільнік сціхне, вы павінны ўсвядоміць, што наступныя пяць хвілін свет не існуе і вы не зварухняцеся з месца. Гэта асабісты час Бога, і вы ўладкоўваецеся ў Ягоным ўласным часе ціха, маўкліва і мірна. Вы пабачыце, наколькі гэта спачатку цяжка; вам будзе здавацца, што нельга скончыць, напрыклад, і не дапісаць ліст ці не дачытаць абзац. Насамрэч вы досыць хутка ўбачыце, што можна лёгка адкласці гэта на тры, пяць ці нават дзесяць хвілін — і нічога не здарыцца. І калі вы робіце нешта, што вымагае ўвагі, то пабачыце, наколькі лепей і хутчэй вы можаце гэта зрабіць потым.

Прывяду іншы прыклад. У пачатку маёй медыцынскай практыкі мне здавалася несправядлівым у дачыненні да людзей, якія былі ў пакоі чакання, калі я занадта доўга займаўся чалавекам у маім кабінеце. Таму ў свой першы прыём у якасці хірурга я стараўся як мага хутчэй аглядаць пацыентаў. Пасля заканчэння прыёму я нічога не мог успомніць пра людзей, якіх кансультаваў, бо пастаянна, пакуль пацыент быў са мной, я глядзеў праз яго пранізлівым позіркам у пакой чакання і лічыў па галовах тых, хто пакуль не быў побач. У выніку мне даводзілася за-

даваць адны і тыя ж пытанні двойчы, а то і тройчы, праводзіць агляд, а па заканчэнні я не памятаў, што ўжо рабіў, а што не. Безумоўна, не ўсе такія, як я; вы, можа, маеце здольнасці запамінаць нашмат лепей за мяне, але гэта проста прыклад таго, што нават з адным з вас можа здарыцца.

Тады я падумаў, што гэта проста несумленна, і вырашыў, што павінен паводзіць сябе так, як быццам чалавек у мяне на прыёме — адзіны на свеце. Як толькі мяне апаноўвала думка «трэба пахутчэй», я спакойна садзіўся ў крэсла і пачынаў кароткую гутарку на некалькі хвілін проста дзеля таго, каб не даць сабе спяшацца. Ужо праз два дні гэта стала непатрэбным. Можна проста быць цалкам засяроджаным на чалавеку ці на справе, якія вось, перад табой; а па заканчэнні высвятляецца, што ты патраціў удвая менш часу, чым на гэта ішло раней, і ўсё пабачыў і пачуў.

З тых часоў я часта даваў такую параду людзям розных прафесій, і яна спрацоўвала. Таму, калі вы будзеце вучыцца спачатку спыняць час, які не рухаецца, а потым час, які імкліва мчыць (а вы яго будзеце спыняць і казаць «не»), выявіцца, што калі ўнутранае напружанне, унутраны гармідар, мітусня і разлад пераадоленыя, час плыве зусім спакойна. Ці можаце вы ўявіць, што за адну хвіліну мінае толькі адна хвіліна? А менавіта так і адбываецца. Гэта дзіўна, але насамрэч так і ёсць, хоць, гледзячы на нашы паводзіны, можна падумаць, быццам пяць хвілін могуць праскочыць за трыццаць секундаў. Не, кожная хвіліна складае столькі ж, колькі і наступная; кожная гадзіна роўная наступнай. Ніякай катастро-

фы не здараецца. Вы можаце сказаць: «Ці паспею я, ці будзе ў мяне час, каб гэта наогул зрабіць?» Я адкажу вам вельмі па-руску: «Як не памрэш раней — то будзе час зрабіць, а як памрэш — то і рабіць не трэба». Ёсць іншае такое ж выслоўе, вы можаце запомніць яго на будучыню: «Не дбай пра смерць: як смерць прыйшла, цябе няма; як сам ты тут, няма смерці» — такі самы прынцып. Навошта хвалявацца пра тое, што вырашыцца само сабой?

Калы вы навучыцеся не мітусіцца, можаце рабіць што заўгодна ў любым тэмпе, з любой ступенню пільнасці і руплівасці, не адчуваючы, што час уцякае ці даганяе. Гэта тое адчуванне, пра якое я ўжо казаў: калі ты ў адпачынку, і ўвесь адпачынак яшчэ наперадзе. Можна быць хуткім ці запаволеным, без усялякага адчування часу, таму што робіш толькі тое, што робіш, без дай прычыны і мэты. І тады вы пабачыце, што здольныя маліцца ў абсалютна любых абставінах, што няма такіх акалічнасцяў, якія могуць замінаць. Перашкода ў малітве можа ўзнікнуць, калі дазволіць буры захапіць сябе ці дапусціць яе ўсярэдзіну, замест таго, каб пакінуць яе вірваць звонку.

Узгадайма евангельскі аповед пра шторм на моры Галілейскім: Хрыстос спіць у чоўне, а навокал усходжваюцца вецер і хвалі. Спачатку апосталы напружана, з надзеяй змагаюцца за жыццё. Потым у нейкі момант іх ахоплівае адчай, і бура, якая была звонку, урываецца ўсярэдзіну — унутры іх таксама ўсчыняецца ўраган. Пакуты і смерць ужо не проста віруюць вакол, яны ўрываюцца ў іх душы. І апосталы звяртаюцца да Хрыста і робяць так, як часта робім

з Богам мы: звяртаем свой позірк да Бога ў хвіліну напружання і няшчасця і абураемся, што Ён такі спакойны. Евангельская гісторыя падкрэслівае гэта, апавядаючы, што Хрыстос салодка спаў — якая зняважа! Яны гінуць, а Яму ўтульна… Менавіта гэта мы так часта адчуваем у дачыненні да Бога: як Ён толькі можа шчасна спачываць, як Ён толькі смее быць у суцесе, калі ***я*** ў бядзе?.. І вучні робяць менавіта так, як часта робім мы. Замест таго, каб звярнуцца да Бога і сказаць: «Ты — сам спакой, Ты — Госпад, скажы слова — і мой слуга акрыяе; скажы слова — і усё выправіцца», яны раскатурхваюць Яго і будзяць ад сну: «Няўжо Табе і справы няма, што мы гібеем?» Інакш кажучы: «Калі Ты нічога не можаш зрабіць, хаця б не спі! Калі Ты няздольны ні на што лепшае, дык памры разам з намі ў пакутах!» Хрыстос на гэта адгукаецца; Ён устае і кажа: «Малавер ы!» І, адхіляючы іх, звяртаецца да непагадзі і быццам апраменьвае буру Сваім унутраным спакоем, Сваёй гармоніяй і мірам і гаворыць ёй: «Супакойся, суцішся!» — і ўсё сціхае.

Мы можам гэта рабіць і мусім гэта ўмець. Але трэба сістэматычна, разважна практыкавацца, гэтаксама, як мы трэніруемся рабіць іншыя рэчы. Навучыцеся кіраваць часам — і што б вы ні рабілі, якім бы не было напружанне, у буры і трагедыі ці проста ў штодзённай мітусні, — вы здолееце захоўваць спакой, заставацца непарушна ў цяперашнім часе, тварам да твару з Госпадам, у маўчанні ці ў словах. Калі вы карыстаецеся словамі, тады вы можаце прынесці Богу ўсё, што навокал вас, усю навакольную буру. Калі вы маўчыце, можаце заставацца ў «зрэнцы»

тарнада, урагану, у самым цэнтры, дзе пануе спакой, даючы буры лютаваць вакол, пакуль самі вы знаходзіцеся там, дзе Бог, у адзіным пункце абсалютнай устойлівасці. Але гэта не кропка, дзе нічога не адбываецца, гэта месца, дзе ўсе супрацьдзейныя сілы сустракаюцца і ўзаемаўраўнаважваюцца, стрымліваюцца ў магутнай руцэ Божай.

Сапраўднае маўчанне — нешта надзвычай насычанае, шчыльнае, яно сапраўды жывое. Я прыгадваю адну гісторыю з жыцій святых пустэльнікаў. Аднаго з іх браты папрасілі сказаць духоўную прамову ў гонар епіскапа, які павінен быў іх наведаць. І ён адказаў: «Не, я нічога не скажу, бо калі яму нічога не гаворыць маё маўчанне, мае словы таксама будуць марнымі». Менавіта такое маўчанне мы павінны спазнаць і навучыцца яго дасягаць. Як гэта зрабіць? Я паспрабую патлумачыць гэта прыпавесцю ці на прыкладзе назірання за птушкамі.

Каб назіраць за абуджэннем птушак у лесе ці полі, трэба прачнуцца раней за іх. Трэба быць ўважлівымі, бадзёрымі, цалкам абудзіцца ад сну раней, чым прачнецца першая птушка, і нават яшчэ да таго, як птушкі наогул адчуваюць надыход раніцы. Выйсці ў поле ці лес і ўладкавацца там нерухома, абсалютна ціха, зусім разняволена, так, каб не паварушыцца і не спудзіць навакольных жывых істот, якія чуйна дрэмлюць. Інакш яны ўцякуць ці зляцяць туды, дзе мы не зможам іх ні чуць, ні бачыць. Назіранне за птушкамі вымагае, з аднаго боку, менавіта такога спакою, такой цішыні і нерухомасці, і ў той самы час — надзвычайнай пільнасці, бо, калі чалавек будзе сядзець у полі, дасынаючы недаспаныя сны

сваёй кароткай ночы, усе птушкі адляцяць задоўга да таго, як ён уцяміць, што сонца ўжо грэе яму спіну. Вельмі важна спалучаць пільнасць і бадзёрасць са спакоем і разняволенасцю; гэта і ёсць сузіральная падрыхтоўка для сузіральнага маўчання. Гэта надта складана — захаваць раўнавагу паміж пільнасцю, якая дазваляе нам трымаць розум цалкам адкрытым, вольным ад забабонаў, ад чаканняў, каб прыняць усё, што б ні выпала на нашу долю, і з другога боку — такім спакоем, які б дазволіў нам успрыняць усё, не разбураючы сваёй прысутнасцю.

Каля дваццаці гадоў таму, амаль адразу, як я прыняў святарства, мяне паслалі служыць перад Раством у дом састарэлых. Там жыла адна старэнькая жанчына, якая пазней памерла ва ўзросце ста двух гадоў. Яна падышла да мяне пасля першай службы і сказала: «Ойча Антоніе, я хацела б атрымаць параду пра малітву». На што я сказаў: «Тады спытайце айца такога й такога». Яна адказала: «Усе гэтыя гады я звярталася да людзей, якія павінны былі б ведаць пра малітву, але ніколі не атрымала ад іх карыснай парады. І я падумала, што вы, напэўна, яшчэ нічога не ведаеце і выпадкова можаце ляпнуць нешта слушнае». Гэта быў вельмі натхняльны пачатак! Таму я сказаў: «А ў чым ваша праблема?» Старая сказала: «Вось ужо чатырнаццаць гадоў я малюся Ісусавай малітвай амаль несупынна, і я яшчэ ні разу не адчула Божай прысутнасці». І тады я сапраўды ляпнуў, што думаў. Я сказаў: «Калі вы ўвесь час гаворыце, то калі Богу Самому ўставіць слова?» Яна спыталa: «А што мне рабіць?» Я параіў: «Пасля сняданку вярніцеся ў свой пакой, спарадкуйце яго, пастаўце

сваё крэсла пазручней, каб за спінкай засталіся ўсе цёмныя закуткі, якія заўжды ёсць у пакоі старой жанчыны і куды ад чужых вачэй схаваны розныя рэчы. Запаліце лампадку перад абразом і найперш агледзьце свой пакой. Проста сядзіце, аглядайцеся і пастарайцеся ўбачыць, дзе вы жывяце, бо я ўпэўнены, што калі вы маліліся ўсе апошнія чатырнаццаць гадоў, то вы ўжо вельмі даўно не заўважалі свайго пакоя. А потым вазьміце вязанне і пятнаццаць хвілін вяжыце перад абліччам Божым, але я забараняю вам прамаўляць хоць адно слова малітвы. Проста вяжыце і старайцеся радавацца цішыні».

Яна падумала, што парада гэтая не надта набожная, але вырашыла паспрабаваць. Праз некаторы час яна завітала зноў і прызналася: «Ведаеце, а гэта працуе». Я спытаў: «А што атрымліваецца і як?», бо мне было вельмі цікава, як дзейнічае мая парада. І яна сказала: «Я зрабіла менавіта так, як вы мне і загадалі. Я ўстала, памылася, прыбралася ў пакоі, паснедала, вярнулася, пераканалася, што там няма нічога, што б мяне турбавала. Тады я паставіла свой фатэль і падумала: «Вось як добра, у мяне ёсць пятнаццаць хвілін, цягам якіх я магу нічога не рабіць і не адчуваць сябе вінаватай!» Потым я агледзелася навокал і ўпершыню за шмат гадоў падумала: «Божухна, які ў мяне прыгожы пакой! Акно выходзіць у сад, пакой зручны, дастаткова месца для мяне і маіх рэчаў, якіх назбіралася за гады». І потым яна дадала: «Я адчувала сябе так ціха, бо пакой быў такі мірны. Цікаў гадзіннік, але гэта не парушала цішыні, ціканне толькі падкрэслівала асаблівы спакой. Праз нейкі час я ўспомніла, што павінна

вязаць перад абліччам Божым, і тады ўзяла пруткі. Я ўсё больш і больш усведамляла цішыню. Пруткі бразгалі аб падлакотнікі фатэля, гадзіннік цікаў так мірна, не было пра што турбавацца, не было патрэбы напружвацца; і спакваля я стала заўважаць, што гэтая цішыня была не проста адсутнасцю шуму, гэтая цішыня «мела сутнасць». Гэта была не адсутнасць нечага, але прысутнасць. Цішыня мела шчыльнасць, насычанасць, і яна пачала напаўняць мяне. Навакольная цішыня пачала запаўняць мяне і зліваццa з цішынёй ува мне». І нарэшце яна сказала нешта вельмі прыгожае, што я потым сустрэў у французскага пісьменніка Жоржа Бэрнаноса; яна сказала: «Я раптам адчула, што гэтая цішыня і ёсць прысутнасць. У сарцавіне гэтай цішыні быў Той, Хто сама Цішыня, сам Мір, сама Гармонія».

Пасля гэтага яна пражыла яшчэ з дзесяць гадоў і казала, што заўжды можа знайсці цішыню, калі сама ціхая і маўклівая. Гэта не значыць, што яна перастала маліцца; гэта значыць, што яна магла перажываць гэтую сузіральную цішыню некаторы час, потым яе розум пачынаў рассейвацца, і яна вярталася да малітвы словамі, пакуль розум зноў не станавіўся спакойным і ўстойлівым; і тады яна ад слоў зноў вярталася ў ранейшую маўклівасць. Гэта магло б здарацца таксама і з намі, калі замест таго, каб мітусіцца і нешта «рабіць», мы маглі б проста сказаць: «Я — у Божай прысутнасці. Якая радасць! Памаўчу».

У жыццяпісе французскага каталіцкага святара, кюрэ з Арсу Жана Мары Віянея ёсць гісторыя пра тое, як стары селянін гадзінамі нерухома сядз-

еў у царкве, нічога не робячы, і святар спытаў у яго: «Што ты тут робіш цэлымі гадзінамі?» І стары адказаў: «Я гляджу на Яго, Ён глядзіць на мяне, і нам так добра разам!»

Гэтага можна дасягнуць, толькі калі мы навучымся да пэўнай ступені маўчаць. Пачнем з маўчання вуснаў, з цішыні пачуццяў, суцішанасці думак, спакою цела. Не варта думаць, што можна пачаць з вышэйшага пункта, з цішыні сэрца і розуму. Мы павінны пачаць з маўчання языка, з маўклівасці цела — гэта значыць захоўваць нерухомасць, пазбавіцца ад напружання, не ўпадаючы ў мроі і расслабленасць, але, паводле формулы аднога з нашых святых, прыпадобніцца да струны скрыпкі, нацягнутай настолькі, каб даваць слушныя ноты, але не напятай да мяжы трываласці, і не заслаба адпушчанай, каб толькі бзынкаць. Пачаўшы з гэтага, мы павінны навучыцца ўслухоўвацца ў цішыню, быць ў дасканалым спакоі; і можа здарыцца, што словы з кнігі Адкрыцця: «Вось, стаю пры дзвярах і стукаюся» будуць збывацца часцей, чым здаецца магчымым.

У наступным раздзеле мы разгледзім асноўныя ўмовы для малітвы, а менавіта — як мы можам звяртацца да Бога па імені і размаўляць з Ім.

Як звяртацца да Бога

У гэтым раздзеле я трошкі скажу пра той момант, калі мы ўжо настроеныя так, што малітва сапраўды становіцца магчымай і жывой. У святле маіх ранейшых слоў, а таксама таго, што і так заўсёды прысутнічае на заднім плане, вынікае, што малітва — гэта зносіны, сустрэча, шлях, праз які мы злучаемся з Жывым Богам. У нейкі момант гэтыя зносіны ажываюць. А гаворачы пра гэта, я хачу пачаць з нечага, што ў роўнай ступені датычыцца і чалавечых стасункаў, і малітвы.

Стасункі становяцца асабістымі і жывымі тады, калі пачынаеш вылучаць чалавека з натоўпу, гэта значыць, калі гэты чалавек становіцца адзіным *у сваім родзе*, калі перастае быць безаблічным ананімам. Адзін філосаф пісаў пра «ананімнае грамадства», дзе замест імёнаў, прозвішчаў і асабістых якасцяў нас вызначаюць праз такія агульныя тэрміны, як «падаткаплацельшчыкі». У нашых узаемаадносінах з людзьмі часцяком прысутнічае гэты элемент ананімнасці: «яны». Мы гаворым у трэцяй асобе, калі адчуваем, што адзін чалавек можа быць лёгка заменены іншым, бо адносіны маюць функцыянальны, а не асабісты характар. Пэўную ***функцыю*** можа выканаць хтосьці іншы, а вось пэўную ***асобу*** нікім не замяніць. У сучаснай англійскай мове, напрыклад (не так, як у многіх іншых мовах), няма розніцы паміж «ты» і «вы» — гавораць «you». А я б сказаў,

што адносіны становяцца рэальнымі з той хвіліны, калі пра некага пачынаеш думаць як пра «ты», а не пра «вы». Справа не ў змене словаўжывання, гэта ўнутраная перамена. Без сумнення, вы выдатна ведаеце, што чалавек можа мець з кімсьці адносіны «я» і «ты» альбо — «я» і «яно».

Малітва пачынаецца тады, калі, замест таго, каб думаць пра далёкага Бога — «Ён», «Усемагутны» і гэтак далей, пачынаеш думаць пра Яго як пра «Ты», калі адносіны больш не ў трэцяй асобе, але ў першай і другой. Возьмем за прыклад кнігу Ёва, дзе канфлікт відавочны; ёсць таксама і іншыя прыклады і ў Пісанні, і ў жыцці — у жыціях святых і ў жыццях грэшнікаў, дзе прысутнічае напружанне і барацьба, — гэта заўжды з'ява **асабістая**. Малітвы няма, пакуль адносіны асцярожныя, на адлегласці, халодныя; пакуль паміж намі і Богам ёсць цырымоніі, пакуль мы не можам проста размаўляць з Ім, а павінны праходзіць праз доўгае і складанае чаргаванне слоў і дзеянняў. Але надыходзіць імгненне, калі праз усё гэта мы прабіваемся і пачынаем гаварыць у першай і другой асобах. Мы кажам «я» і чакаем, што Ён будзе «Ты» — у адзіночным ліку. Не ветлівае пачцівае «Вы» ў множным ліку, але адзіночнае і ўнікальнае «Ты».

У цёплых чалавечых стасунках ёсць яшчэ адзін момант — калі мы падбіраем, як чалавека называць. Я кажу не пра агульныя прозвішчы, якія не маюць асаблівага зместу, але пра той момант, калі нам адкрываецца, як чалавек і ягонае імя звязаны. Вы, пэўна, ведаеце, наколькі асабістай — у станоўчым, але і ў адмоўным сэнсе — можа быць мянушка. Мя-

нушка можа раструшчыць чалавека, выкрасліць з жыцця, разбурыць усё, што ёсць між дваіх людзей; але яна можа таксама быць імем, якое ўжываюць толькі двое ці вельмі вузкае кола людзей, настолькі глыбока і шчыльна звязаных адно з адным, што гэтае імя для іх напоўнена сэнсам, бо яно надзвычай асабістае. У нейкім сэнсе, чым больш яно абсурднае, тым больш асабістае: таму што ніхто, апроч цябе, яго б не прыдумаў.

Таксама ёсць прозвішчы. Прозвішча часта нам здаецца адчужаным, агульным паняццем кшталту «чалавецтва»: у столькіх людзей прозвішчы адноль-кавыя! Разам з тым, калі прыгледзецца да прозвішча ў чалавечых адносінах больш уважліва, можна раптам зразумець, што яно — адзнака супольнасці. З пакалення ў пакаленне, углыб гісторыі, людзі адной з намі крыві, чыё жыццё — у нашых касцях, у нашай спадчыннасці, у нашай псіхіцы, насілі гэтае прозвішча, і яно, сягаючы далёка ў мінулае, звязвае нас з пакаленнямі людзей, якія жылі да нас, і, верагодна, будзе звязваць з наступнымі пакаленнямі — і праз многія повязі шлюбу і сям'і сплятаць шырокую сетку людзей, глыбока звязаных адно з адным.

Замест таго, каб думаць аб прозвішчах, падумаем пра спадчынасць, генеалогію — хіба не гэта мы знаходзім пра Хрыста ў двух Евангеллях? Хіба не на гэта звяртае ўвагу радавод: сувязь канкрэтных, рэальных людзей ад пакалення да пакалення? Таму прозвішча можа быць надзвычай цікавым, бо змяшчае ўсё наша мінулае ў адным слове, і калі падумаць пра іншых людзей ў такіх катэгорыях, то нават прозвішчы могуць ажыць. У адрозненне

ад мянушкі, якая перадае ўнікальнасць чалавека і непаўторнасць нашых з ім стасункаў, прозвішча — праз гэтага ўнікальнага чалавека — ураз звязвае нас з цэлым светам людзей…

Таксама ёсць яшчэ і імя, якое даецца ў хросце: гэта імя, праз якое Бог прымае чалавека ва ўладаранне. Хрысціянскае імя звязвае чалавека з Богам, бо, атрымліваючы яго, чалавек памірае з Хрыстом і зноў ўваскрасае з Ім; але яно таксама звязвае нас з мноствам людзей, якія насілі такое самае імя, і перш за ўсё — са святым, які ператварыў гэтае паганскае імя ў хрысціянскае, царкоўнае.

Ёсць у нас і яшчэ адно імя — якога мы не ведаем. Узгадайма ўрывак з кнігі Адкрыцця, дзе сказана, што ў будучым Царстве кожны атрымае белы камень, і на гэтам камені будзе напісана яго імя, вядомае толькі Богу і таму, хто яго атрымлівае. Гэта не мянушка, не прозвішча, не імя, атрыманае ў хросце. Гэта імя, слова, цалкам тоеснае нам, якое з намі супадае, яно і ***ёсць*** мы. У нейкім сэнсе можна нават сказаць, што гэта тое слова, якое прамовіў Бог, калі Ён Сваёй воляй паклікаў нас у быццё; гэтае імя — мы, а мы — яно. Гэтае імя вызначае нашу абсалютную і непаўторную ўнікальнасць у вачах Бога. Ніхто не можа ведаць гэтага імені, як, зрэшты, ніхто не можа ведаць нас, як Бог; і разам з тым менавіта з гэтага імені вынікае ўсё, што толькі можа быць спазнана пра нас.

Магчыма, вам дзіўна, навошта так засяроджвацца на імёнах. А раблю я гэта таму, што часткова наша малітва звернута наўпрост да Бога і складае нашу асабістую лучнасць з Ім, але з іншага боку, наша

малітва — гэта наша повязь з усім навакольным светам; і ў малітве адзін за аднаго, і ў малітве за свет мы прыносім Богу імёны і нічога болей. Але гэтыя імёны або напоўнены сэнсам, або не — у залежнасці ад акалічнасцяў, у залежнасці ад таго, ці можам мы адчуваць глыбіню таго, што мы прамаўляем. Калі мы называем Богу імёны людзей без асэнсавання, ужываючы іх як цэтлікі, без глыбіні, то нашы адносіны мала чаго вартыя; калі мы прамаўляем імя з нейкай доляй зместу, які я паспрабаваў каротка выкласці, тады наша малітва не толькі прыносіць чалавека Богу, як бы на адкрытых далонях, але і знітоўвае нас з гэтым чалавекам глыбінна — не спачуваннем, не любоўю, але атаясамленнем, лучнасцю, салідарнасцю зусім іншай якасці.

Тое самае і наадварот. Калі мы не можам знайсці для Бога адпаведнага імені, то ў нас няма свабоднага, сапраўднага, радаснага, адкрытага доступу да Яго. Да тае пары, пакуль нам прыходзіцца звяртацца да Бога агульнымі найменнямі кшталту «Усемагутны», «Госпад Бог», вызначаючы Яго па ўласцівасцях, робячы са звароту ананімны, родавы панятак, мы не можам ужываць гэтае слова ці словазлучэнне як асабістае імя. Але часам, напрыклад у духоўных аўтараў, прарываецца зварот — амаль мянушка, слова, якое б ніхто іншы не прамовіў, якое знаходзіцца на мяжы магчымага і немагчымага і якое з'явілася толькі таму, што існуюць рэальныя ўзаемаадносіны. Памятаеце псалом, у якім, пасля больш стрыманых зваротаў, знянацку ў Давіда вырываецца: «Ты мая Радасць!» Тут увесь псалом ажывае. Кажучы «О Госпад наш!», «О Усемагутны»

і гэтак далей, мы як бы прапануем Богу факты пра Яго Самога; але калі прарываецца і вымаўляецца «Ты мая Радасць!» — гэта зусім іншая справа. Калі можаш сказаць Богу: «О Радасць!», ці калі можаш сказаць: «Ах, Боль майго жыцця… Ты, Які стаіш у яго цэнтры крыніцай пакут, праблемай, каменем спатыкнення!», калі мы можам звярнуцца да Яго са страсцю — тады ўзаемадносіны малітвы наладзіліся.

Таму нам вельмі важна задумацца і ўпэўніцца, ці ёсць у нашым досведзе імёны, якімі мы можам звяртацца да Бога. Да таго ж час ад часу звароты могуць змяняцца. У нейкую пару для нас найбольшае значэнне мае адзін аспект стасункаў з Богам, а ў іншыя часы мы бачым іншыя аспекты, гэтак жа, як у сяброўстве ці ў каханні мы не выбіраем адзін-адзінюткі зварот — існуе цэлая палітра адценняў і нюансаў. Ёсць звароты «Усемагутны», «Госпад», «Творца», «Падавец», «Прамудрасць», але таксама і вельмі простае імя **Ісус**, якое я назваў імем «хрысціянскім».

Не здзіўляйцеся, што ў Хрыста ёсць «хрысціянскае» імя: я спадзяюся, вы разумеце, пра што я кажу. Гэта як адна мая прыхажанка спрачалася з мужам-нехрысціянінам, які сорак гадоў іх супольнага жыцця сіліўся даказаць ёй нікчэмнасць хрысціянства, і аднойчы, у адчаі, яна сказала яму: «***Як можаш*** ты казаць такое, калі Сам Бог спачатку быў іўдзеем, а потым стаў хрысціянінам?» Магчыма, маё сцвярджэнне, што Ісус — гэта хрысціянскае імя, нагадвае такі прымітыўны падыход, але разам з тым гэта імя чалавека, першае хрысціянскае імя, запісанае ў іменаслоў Царквы. І калі мы будзем пра гэта памя-

таць, калі мы пачнём разумець, якую блізкасць гэтае імя стварае паміж Хрыстом і намі, тады мы зразумеем, чаму пакаленні хрысціян так даражылі гэтым імем. Напэўна, гэта было не таму, што апостал Павел казаў: «каб прад імем Ісуса схілілася кожнае калена»[1], бо, хоць гэта бясспрэчная праўда, але не гэта робіць імя цёплым і прывабным. Тое самае было б праўдай і для зваротаў «Усемагутны», «Госпад», але імя Ісус — жывое, сапраўднае, асабістае імя.

Ёсць багата іншых імёнаў. Я ўпэўнены, што, калі аднойчы ў вас вырвецца «О Радасць мая!» ці іншы падобны воклiч, гэта і будзе імгненнем раскрыцця адносін паміж Богам і вамі, менавіта вашых асабістых адносін з Ім, адрозных ад стасункаў, якія агульныя для мноства іншых людзей. Я не кажу, што такіх агульных стасункаў не павінна быць. У нас для Бога ёсць словы, якія належаць усім людзям, але ёсць і словы, якія належаць толькі мне ці толькі вам, гэтак жа, як і ў чалавечых адносінах ёсць прозвішчы, ёсць імёны, атрыманыя ў хросце, ёсць мянушкі. Добра мець імя-мянушку, якім можна звяртацца да Усемагутнага Бога, мянушку, у якой змяшчаецца ўся глыбіня вашага сэрца, уся цеплыня, на якую вы здатныя; праз яе вы кажаце: «У маёй унікальнасці вось як я ўспрымаю Тваю ўнікальнасць».

Калі ты асэнсоўваеш сваё месца адносна Бога, наколькі ты аддалены ад Яго, надыходзіць момант стукання ў дзверы, паглыблення ў сябе больш і больш, скіравання малітвы на сябе, аж да таго самага месца, дзе знаходзяцца тыя дзверы, у якія можна пастукацца, якія могуць адчыніцца. Урэшце надыдз-

[1] Філ. 2,10 (перакл. В.Сёмухі. — Заўв. рэд.).

е такое імгненне, калі яны і адчыняцца, і тады ў цябе павінна быць для Бога імя. Будзь гатовым прамовіць слова, якое засведчыць, што гэта менавіта **ты** шукаў і шукаеш Яго, а не проста нейкі абстрактны чалавек шукае ананімнага Бога.

У працэсе пошукаў ты перажывеш боль, пакуты, надзею, чаканне — увесь спектр чалавечых пачуццяў. Бог будзе жаданым — і Ён будзе расчараваннем; Ён будзе Тым, па Кім тужыш, і Тым, Каго ненавідзіш, бо Ён уцякае ад цябе; Тым, Каго любіш, нягледзячы ні на што, без Каго не можаш жыць — і Тым, Каму не можаш дараваць, што Ён не адгукаецца, і яшчэ мноства іншага. І цягам гэтых пошукаў спаквaля будуць паўставаць словы, якімі ты можаш звяртацца да Бога са свайго досведу шукання крыніцы жывой вады; словы, якія належаць табе асабіста. Можа так здарыцца, што яны шмат у чым супадаюць са словамі, якія ўжываліся іншымі; але тады яны перастануць быць безаблічнымі словамі, а стануць словамі, якія хоць і агульныя ў цябе з іншымі людзьмі, але сталі напраўду тваімі ўласнымі. Толькі не варта ўжываць слоў з агульнага слоўніка, якія не належаць асабіста табе. Калі ты пачуеш бразганне ланцужка з таго боку дзвярэй, калі адчуеш, што яны вось-вось адчыняцца, май напагатове свае ўласныя словы, называй Бога імем, якое Ён здабыў менавіта ў тваім жыцці. У гэты момант і адбудзецца ваша сустрэча. У адносінах, якія цяпер у сваім развіцці будуць пастаянна паглыбляцца і ўзбагачацца, у цябе даволі часу, каб знайсці іншыя словы, якімі ты пераадолееш выпакутаваныя словы крыўды і нянавісці, і, як пакутнікі з кнігі Адкрыцця, скажаш: «правед-

ныя і праўдзівыя шляхі Твае, Цару сьвятых!»[6]. І тады гэтыя словы змыюць усе словы горычы, усе жорсткія найменні, а застануцца толькі асабістыя імёны, якія належаць менавіта табе і якія стануць сапраўднымі ўзаемадносінамі і сапраўднай лучнасцю з жывым Богам.

Усё, што я сказаў пра тое, як навучыцца малітве, мне здаецца дастаткова практычным, каб вы змаглі паспрабаваць. Безумоўна, можна было б гаварыць яшчэ шмат, і пра гэта, і пра іншае, але паспрабуйце дзейнічаць хаця б вось па гэтых кірунках і пабачыце, што часу не змарнуеце. Шукай імя, і калі не дасі рады знайсці яго, не здзіўляйся, што ніхто не чуе: ты не клічаш.

[6] Адкр. 15,3 (перакл. В.Сёмухі. — Заўв. рэд.).

Змест

3 Ад выдаўцоў
7 Божая адсутнасць
21 Вось дзверы — стукай
35 На шляху ўглыб
60 Як управіцца з часам
76 Як звяртацца да Бога

ПРА ЦЭНТР «ЭКУМЕНА»

Цэнтр «Экумена» — культурна-асветніцкая ўстанова, заснаваная групай хрысціян-беларусаў, мэтамі якой з'яўляецца распаўсюджанне хрысціянскіх каштоўнасцяў, заахвочванне міжхрысціянскага дыялогу, перакłады багаслоўскіх, навуковых і прапаведніцкіх тэкстаў на беларускую мову.

Для тых, хто жадае фінансава падтрымаць працу Цэнтра па перакладзе тэкстаў на беларускую мову, паведамляем банкаўскія рэквізіты Цэнтра:

Атрымальнік плацяжу:
Цэнтр «Экумена»,
юрыдычны адрас: 220007 г. Мінск,
вул. Жукоўскага, д.1, офіс 9.
УНП 191189224

Банк: ЗАТ «БелСвісБанк» код 175,
РКЦ №13: г. Мінск, пр. Дзяржынскага, 80

Разліковы рахунак:
3015028303000 (BYR, беларускія рублі);
3015028303013 (EUR, еўра)
З пазнакай «пераклад на беларускую мову»

РЭЛІГІЙНАЕ ВЫДАННЕ

Антоній, мітрапаліт Суражскі

Як навучыцца малітве

Адказны за выпуск і рэдактар
А. Майдановіч

Падрыхтоўка да друку
З. Строцаў, Н. Васілевіч

Вёрстка
А. Дземчанка

Стылістычны рэдактар і карэктар
М. Сідаровіч

Фонд «Духоўная спадчына мітрапаліта
Суражскага Антонія»
Россия, 125252 Москва, ул. Алабяна, д. 17, кв. 135
alenam@orc.ru www.mitras.ru

Падпісана да друку
Фармат 84 × 108 1/32. Папера афсет.
Наклад 30 экз. Заказ № 49632.
Надрукавана ў друкарні
“Вишнёвый пирог”.

“. . .малітва — гэта зносіны, сустрэча, шлях,
праз які мы злучаемся з Жывым Богам”

Антоній Мітрапаліт Суражскі